Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва
Кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва

**УЗГОДНЕНА**
Загадчык кафедры
________________ Р. Ф. Шаура
«_______»_________________ 2015 г.

**УЗГОДНЕНА**
Дэкан факультэта
________________ Н. У. Карчэўская
«_______»_________________ 2015 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

*па спецыяльнасці 1-15 02 01 «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» па напрамку спецыяльнасці 1-15 02 01-07 «Дэкаратыўна–прыкладное мастацтва» (рэстаўрацыя вырабаў)», па спецыяльнасці 1-18 01 01 «Народная творчасць» па напрмаку спецыяльнасці 1-18 01 01-04 «Народная творчасць» (народныя рамёствы)»*

Складальнікі: А.І. Непачаловіч, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва,
Т.І. Васюк, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

Разгледжана і зацверджана

на пасяджэнні Савета ўніверсітэта ___ _________________ 20__г.

Пратакол №__

**Непачаловіч Ала Іванаўна,** дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў;
**Васюк Тамара Іванаўна,** дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

Рецензенты:

**Жук Валерый Іванавіч,** дырэктар філіяла «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы» ГНУ «Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси», загадчык аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, доктар мастацтвазнаўства, прафесар;

**Пракапцова Вера Паўлаўна,** загадчык кафедры сусветнай і айчыннай мастакай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, доктар мастацтвазнаўства, прафесар.

Разгледжаны і рэкамендаваны да сцвярджэнні:
кафедры ______________________________________________________
(пратакол ад ___________ № _____________);
Саветам факультэта ______________________________________________
(пратакол ад _____________ № ____________).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ВМК…………………………………......4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЕЛ ВМК ……………………………….........7
2.1 Вучэбна-метадычны дапаможнік…………………………………..7
2.2 Канспект лекцый…………………………………………..............20
2.2 Відэа- і аудэаматэрыялы……………………………………...…45
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЕЛ ВМК ……………………………………….47
3.1 Практыкум………………………………………………….........47
3.2 Апісанне лабараторных работ ………………………………….…50
4. РАЗДЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ВМК ……………………………….68
4.1 Заданні да контролю самостойнай работы студэнтаў…………………..68
4.2 Тэматыка курсавых і дыпломных работ………………………………69
4.3 Пералік пытанняў да заліку і экзамену……………………………...70
4.4 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэтаў……73
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЕЛ ВМК ………………………….................77
5.1 Вучэбная праграма……………………………………................77
5.2 Асноўная літаратура……………………………………………..87
5.3 Дадатковая літаратура……………………………………………...88

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна ”Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” разлічана на засваенне студэнтамі матэрыялу па развіццю мастацтва ткацтва і вышыўкі, керамікі, габелена, саломапляцення, роспісу тканін і мастацкай апрацоўкі дрэва.

Вучэбна-метадычны комплекс распрацаваны для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па напрамку спецыяльнасці 1-15 02 01-07 ”Дэкаратыўна – прыкладное мастацтва” (рэстаўрацыя вырабаў)”, спецыяльнасці 1-18 01 01-04 «Народная творчасць» (народныя рамёствы)”.

Тэматыка заняткаў накіравана на ўдасканаленне ў свядомасці будучых прафесійных спецыялістаў дэкаратыўна-прыкладное мастацтва па захаванні спадчыны Беларусі. Змест дысцыпліны мае на ўвазе набліжэнне сучасных студэнтаў да разумення спецыфікі ўзаемасувязі традыцыйнай і сучаснай дэкаратыўна-прыкладной творчасці, что значна спрыяе выхаванню высокапрафесійных кадраў у галіне культуры і мастацтва.

Выкладанне дысцыпліны ”Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” прадугледжвае сувязь з іншымі дысцыплінамі: “Гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва”, “Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў”, “Кампазіцыя”, “Колеразнаўства”, “Матэрыялазнаўства”, “Малюнак”, “Жывапіс”.

Асноўны змест дысцыпліны складаюць заданні на засваенне мастацкіх тэхнік і тэхналогій апрацоўкі матэрыялаў, вывучэнне традыцыйных і сучасных формаў і відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, асаблівасцей мастацка-вобразных кампазіцыйных, тэхналагічных і канструктыўных прыёмаў у творчым працэсе.

Асноўнай мэтай дысцыпліны з’яўляецца развіццё мастацкіх здольнасцяў студэнтаў, фарміраванне асобы мастака і яго нацыянальнай свядомасці праз далучэнне да традыцый народнага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сувязі з гэтым у рамках дысцыпліны прадугледжана вырашэнне натупных задач:

– пазнаёміць студэнтаў з асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй вывучаемай дысцыпліны;

– раскрыццё асаблівасцей традыцыйнай беларускай культуры праз аналіз гісторыі развіцця рамяства;

– атрыманне ведаў па рэгіянальных адметнасцях беларускага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

– развіццё мастацка-вобразнага мыслення;

– авалоданне выразнымі сродкамі дэкаратыўнай кампазіцыі;

–фарміраванне практычных навыкаў і ўменняў, неабходных для стварэння мастацкіх твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У выніку вывучэння дысцыпліны ”Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” студэнты павінны ведаць:

– агульнатэарэтычныя пытанні беларускай традыцыйнай мастацкай творчасці;

– асноўныя падыходы выкарыстання мастацкіх традыцый беларусскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

– асноўныя метады па рэстаўрацыіі, рэканструкцыі і рэтрансляцыі вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

Студэнты павінны ўмець:

– валодаць мастацка-вобразным мысленнем;

– выкарыстоўваць выразнымі сродкамі дэкаратыўнай кампазіцыі;

– выконваць практычныя заданні па стварэнні твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва па напрамку мастацка-стылёвага вырашэння і выканання ў матэрыяле.

Да эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання па дысцыпліне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія адпавядаюць агульным патрабаванням вышэйшай школы адукацыі, адносіцца вопыт самастойных заняткаў па кампетэнцыі студэнта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя задачы самастойных заняткаў:

– удасканаленне мастэрства стварэння творчых прац; тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі ў музеях і мастацкіх галерэях, выкарыстанне аўдыя- і відэадапаможнікаў);

– праблемныя творчыя дыялог і дыскусіі;

– кантрольна-ацэначныя метады.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае вывучэнне асобных тэм і раздзелаў дысцыпліны з выкарыстаннем метадычных рекамендацый і літаратуры, рэкамендаванай выкладчыкам. Кантроль самастойнай работы студэнтаў адбываецца перыядычна падчас аўдыторных заняткаў.

Дысцыпліна “дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” вывучаецца з трэццяга па шосты семестр. Асноўныя формы заняткаў – лекцыі і лабараторныя заняткі.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па вывучэнні дысцыпліны ”Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” праграма дысцыпліны разлічана на 290 гадзін, у тым ліку 146 гадзін аўдыторных заняткаў. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 40 гадзін, лабараторных – 106 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік і экзамен.

Атрыманыя веды і навыкі з’яўляюцца неабходнай часткай падрыхтоўкі студэнтаў да выканання дыпломнай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЕЛ

### 2.1. Вучэбна-метадычныя дапаможнікі


Министерство культуры Республики Беларусь
Учреждение образования
«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ»

научно-творческая лаборатория “Традиционные ремесла белорусов”

«Разработка научной основы и создание учебно-методических образовательных и художественных материалов по белорусскому народному декоративно-прикладному искусству»

**«Народный художественный текстиль (ткачество, вышивка, плетение, вязание) Центрального региона Беларуси»**

учебно-методическое пособие

Мінск 2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Авторский коллектив**

**Шауро Григорий Федорович**, доктор искусствоведения, профессор, заведующий кафедрой народного декоративно-прикладного искусства

**Малахова Лидия Олеговна**, доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства

**Васюк Тамара Ивановна**, доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства

**Непочелович Алла Ивановна**, доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства

Учебно-методическое пособие состоит из материалов по изучению художественных и технологических традиций ручного узорного т качества Беларуси. Предназначается в качестве пособия преподавателям декоративно-прикладного искусства для организации и проведения занятий по овладению практическими навыками в области художественного ткачества учащихся средних специальных и высших заведений.

2

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Министерство культуры Республики Беларусь
Учреждение образования
«БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ»

**научно-творческая лаборатория "Традиционные ремесла белорусов"**

«Разработка научной основы и создание учебно-методических образовательных и художественных материалов по белорусскому народному декоративно-прикладному искусству»

# «Народная художественная керамика Центрального региона Беларуси»

**учебно-методическое пособие**



Минск 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Авторский коллектив

Шауро Григорий Федорович, доктор искусствоведения, профессор, заведующий кафедрой народного декоративно-прикладного искусства

Малахова Лидия Олеговна, доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства

Васюк Тамара Ивановна, доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства

Непочелович Алла Ивановна, доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства

Учебно-методическое пособие состоит из материалов по изучению художественных и технологических традиций народной керамики Беларуси. Предназначается в качестве пособия преподавателям декоративно-прикладного искусства для организации и проведения занятий по овладению практическими навыками в области художественной керамики учащихся средних специальных и высших заведений.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УА"БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ"
НТЛ "ТРАДЫЦЫЙНЫЯ РАМЁСТВЫ БЕЛАРУСАЎ"

«Распрацоўка навуковай асновы і стварэннее вучебна-метадычных адукацыйных і мастацкіх матэрыялаў по беларускаму народному дэкаратыўна-прыкладному мастацтву»

# АСНОЎНЫЯ ТЭХНІКІ ТРАДЫЦЫЙНАГА ТКАЦТВА БЕЛАРУСІ І СХЕМЫ ПЕРАПЛЯЦЕННЯЎ ЧАТЫРОХНІТОВЫХ АЎТЭНТЫЧНЫХ ТКАНІН

Метадычныя рэкамендацыі

Мінск 2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аўтарскі калектыў

Шаура Рыгор Федаравіч, доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры народнага дэкаратыўна – прыкладнога мастацтва

Малахава Лідзія Алегаўна, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна – прыкладнога мастацтва

Васюк Тамара Іванаўна, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна – прыкладнога мастацтва

Непачаловіч Ала Іванаўна, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна – прыкладнога мастацтва

Вучэбна-метадычны дапаможнік складаецца з матэрыялаў па вывучэнню асноўных тэхнік ручнога ўзорыстага ткацтва Беларусі. Прызначаецца ў якасці дапаможніка выкладчыкам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва для арганізацыі і правядзення заняткаў па авалоданню практычнымі навыкамі ў галіне мастацкага ткацтва навучэнцаў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых установ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Традиционные гончарные формы Центрального региона Беларуси



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
УО «БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ»
НТЛ «ТРАДИЦИОННЫЕ РЕМЁСЛА БЕЛОРУСОВ»

«Разработка научной основы и создание учебно-методических образовательных и художественных материалов по белорусскому народному декоративно-прикладному искусству»

# Традиционные гончарные формы Центрального региона Беларуси

Методические рекомендации

Минск 2011

2

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

СОСТАВИТЕЛИ:

Шауро Григорий Федорович,
доктор искусствоведения, профессор, заведующий кафедрой народного декоративно-прикладного искусства учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»

Малахова Лидия Олеговна,
доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»

Васюк Тамара Ивановна,
доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»

Непочелович Алла Ивановна,
доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»

Учебно-методическое материалы необходимые для изучения основных техник гончарства и керамики Беларуси. Назначается в качестве пособия преподавателям декоративно-прикладного искусства для организации и проведения занятий по овладению практическими навыками в области декоративно-прикладного искусства учащихся средних специальных и высших заведений.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТРАДИЦИОННЫЕ ФОРМЫ БЕЛОРУССКОЙ КЕРАМИКИ



МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
УО «БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ»
НТЛ «ТРАДИЦИОННЫЕ РЕМЁСЛА БЕЛОРУСОВ»

«Разработка научной основы и создание учебно-методических образовательных и художественных материалов по белорусскому народному декоративно-прикладному искусству»

# ТРАДИЦИОННЫЕ ФОРМЫ БЕЛОРУССКОЙ КЕРАМИКИ

Методические рекомендации

Минск 2011

2

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

СОСТАВИТЕЛИ:

Шауро Григорий Федорович,
д-р искусствоведения, профессор, заведующий кафедрой народного декоративно-прикладного искусства
учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»

Малахова Лидия Олеговна,
доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства
учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»

Васюк Тамара Ивановна,
доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства
учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»

Непочелович Алла Ивановна,
доцент кафедры народного декоративно-прикладного искусства
учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»

Учебно-методическое материалы необходимые для изучения основных техник гончарства и керамики Беларуси. Назначаются в качестве пособия преподавателям декоративно-прикладного искусства для организации и проведения занятий по овладению практическими навыками в области декоративно-прикладного искусства учащихся средних специальных и высших заведений.

3

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**2.2 Канспект лекцый лекцыі па дысцыпліне ”Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” для студэнтаў спецыяльнасці 1-15 02 01-07 ”Дэкаратыўна – прыкладное мастацтва” (рэстаўрацыя вырабаў)”, спецыяльнасці 1-18 01 01-04 “Народная творчасць” (народныя рамёствы)”**

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва адносіцца да спрадвечных каштоўнасцяў традыцыйнай беларускай культуры. Вытокі гэтай найважнейшай галіны выяўленчага мастацтва зыходзяць з далёкага мінулага. З даўніх часоў асаблівае месца ў жыццядзейнасці і духоўнай сферы людзей займала дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, якое стваралася і праяўлялася ў самых разнастайных відах і формах творчай дзейнасці. Неабходныя ў жыцці прадметы рабіліся не толькі зручнымі і прыгожымі, але ў іх укладваўся алегарычны, рэлігійна-містычны і абрадавы змест. Вырабы ганчарства і керамікі, ткацтва і вышыўкі, апрацоўкі дрэва і шкла, кавальскай справы, пляцення з прыродных матэрыялаў, выцінанкі і іншыя, неаддзельныя ад побыту людзей, выконвалі не толькі утылітарна-функцыянальную ролю, але і з'яўляліся прадметамі эстэтычнай арганізацыі асяроддзя. Яны нясуць у сабе адбітак шматвяковай гісторыі краіны, у якім адлюстраваны жыццёвы аблічча і духоўны вопыт народа, а таксама ўзбагачаная тонкім густам і майстэрствам выканання эстэтычны ідэал. Разнастайныя вырабы, створаныя па законах мастацтва, не толькі ўпрыгожваюць вясковы побыт, але і нясуць у сабе сімвалічны код жыццёвага шляху чалавека з першых і да апошніх дзён яго жыцця. У кампазіцыйных рытмах, пластычных і арнаментальных рашэннях, каларыстыкі прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва народных майстроў ярка дэманструецца магутная сіла прыгажосці навакольнага Свету, выразна пазначаныя лёс і характар беларусаў.

Але найбольш распаўсюджанымі напрамкамі ў галіне стварэння аўтэнтычных утылітарна-дэкаратыўных прадметаў заўсёды былі кераміка,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ткацтва,  а таксама апрацоўка дрэва, метала і шкла. Таму на базавай аснове гэтых відаў традыцыйнай творчасці і сфармавалася сучаснае прафесійнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Аўтар – дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна –прыкладнога мастацтва А.І. Непачаловіч

## 2.2. Мастацкае рамяство беларускага узорнае ткацтва

Ручное ўзорыстае ткацтва – гэта незвычайна выразная і самабытная галіна беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Традыцыя вырабу дамотканых тканин была шырока распаўсюджана на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Стагоддзямі развіваліся спосабы апрацоўкі сыравіны: ільну, воўны, бавоўны, удасканальваліся ткацкія тэхнікі і прыёмы. З часам знешні выгляд тканін набываў характэрныя мастацкія рысы ў залежнасці ад існавання ткацкіх цэнтраў на тэрыторыі канкрэтных рэгіёнаў.

Археалагічныя сведчанні існавання ткацтва на тэрыторыі Беларусі адносяцца да эпохі позняга неаліту, калі былі вядомы самыя прымітыўныя спосабы вырабу на пальцах і сцяне тканін у выглядзе вузкіх пояскоў, пашытых па даўжыні. Значна пазней з'яўляецца спосаб пляцення з дапамогай спецыяльнага четырёхнитового прыстасаванні падобнага на бердзечка, якое выкарыстоўвалася ў рускіх і беларусаў яшчэ ў пачатку 20 стагоддзя, як прыстасаванне паясоў. Існаванне найпростых тканін палатнянага перапляцення яшчэ ў эпоху зарубінецкай культуры пацвярджаюць археалагічныя матэрыялы – адбіткі тканін на гліняным посудзе і вялікая колькасць прасніцы для веретён. Удасканаліць стала тканьё на вертыкальным ткацкім станку. У сувязі з тым, што пісьмовыя крыніцы аб узнікненні ў славянскіх народаў вертыкальнага і гарызантальнага ткацкага станка не выяўлены, а археалагічныя матэрыялы з-за дрэннай захавальнасці драўніны адсутнічаюць, амаль немагчыма прасачыць шлях развіцця ткацкай стана са старажытных часоў. Таму першародная яго канструкцыя ў старажытнасці не высветлена. Аднак некаторыя навукоўцы мяркуюць паслядоўнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узнікнення двух тыпаў станкоў – вертыкальны, а затым горизонтальны. Гэтая паслядоўнасць тлумачыцца Нідэрле тым, што тэрмін «стан» з'яўляецца вытворным ад слова «стаяць».

Найбольш высокага ўзроўню развіцця беларускае ткацтва, якое развівалася ў напрамку агульнаславянскіх традыцый, дасягнула ў 10-13 ст.ст., калі шырокае распаўсюджанне атрымаў гарызантальны станок. Менавіта да гэтага перыяду адносіцца выяўленыя пры раскопках старажытнага Гродна ткацкія чаўнок – гэта прылада прызначана выключна для гарызантальнага ткацкага станка. Пазней археолагамі былі выяўленыя чаўнакі і дэталі гарызантальных ткацкіх станкоў у Полацку, Віцебску і Мінску.

Пачынаючы з 11-13 ст.ст. у тканінах сустракаюцца ўзоры з больш складаным чым палатняна-саржавае перапляцценне – гэта сведчыць аб тым, што тэхніка ткання пачынала ўдасканальвацца. У 16-18 ст.ст. ткацтва з'яўлялася паўсюдна развітым рамяством. Былі арганізаваны цэха ткачоў ў буйных цэнтрах ткацтва ў Слуцку, ў 1605 г. у Міры, звесткі З 1777 г. у Гродна, а Мінскі дзейнічаў да 1870-х гадоў.

На жаль тканыя вырабы – адносна няўстойлівы матэрыял, таму узораў старажытных тканін амаль не захавалася, але ўяўленне аб іх дэкоры даюць творы выяўленчага мастацтва. На гравюрах выданняў Ф.Скарыны 16 ст., а пазней на беларускіх абразах 17-18 напрыклад на іконе «Каляды богородицы 1649г., сустракаюцца выявы арнаментальных тканін падобных з народнымі ўзорнымі вырабамі беларускіх ткачых канца 19-пачатку 20 ст. Менавіта ў гэты перыяд, калі мануфактурная вытворчасць у Беларусі прыходзіць у заняпад, з-за нізкай пакупной здольнасці сялян і падвышанай патрэбнасці ў даматканых тканінах, пачынаецца паўсюдны росквіт народнага ткацтва. На аснове хатняга рамяства ўзнікалі і развіваліся саматужныя ткацкія промыслы, арганізоўваліся школы-майстэрні. У выніку іх дзейнасці ўзбагачаліся традыцыйныя тэхнікі і прыёмы, якімі валодалі народныя ткачыхі.

На тэрыторыі Беларусі ў канцы 19 пачатку 20 ст. цалкам сфармаваліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўныя этнаграфічныя рэгіянальныя і лакальныя мастацка-стылістычныя традыцыі узорнага ткацтва. Яно стала гуляць ролю яркай мастацкай з'явы ў традыцыйнай культуры краіны ў якасці самабытнага і непаўторнага выгляду народнага мастацтва. Да гэтага часу цалкам гістарычна склаліся этнаграфічныя рэгіёны:

* Паўночны – Паазер’е;
* Усходні – Падняпроўе;
* Цэнтральны – Цэнтральная Беларусь;
* Паўночна-Заходні – Панямонне;
* Усходняе Палессе;
* Заходняе Палессе.

У кожным з гэтых рэгіёнаў можна вылучыць больш дробныя адзінкі - лакальныя раёны і подрайоны:

* у Паўночным – паўночна-ўсходняя і паўночна-заходняя часткі;
* у Васточным- левабярэжнай і правабярэжнай Падняпроўе і Пасожжа;
* у Цэнтральным- Бярэзінскі, Слуцка-Нясвіжскі і Мінскі раёны;
* у Паўночна-Заходнім – левабярэжнае і правабярэжнае Панямонне;
* ва Усходнім Полессі – Мозыршчына, Тураўшчына, Прыпяцкі р-н;
* у Заходнім Полессі – Пінскае Палессе, Загараддзе і Подляшша.

Мастацкія і тэхналагічныя асаблівасці народных тканін развіваліся ў залежнасці ад навакольнага прыроды, сацыяльна-эканамічных працэсаў, жыццёвага асяроддзя, гаспадарчай дзейнасці жыхароў кожнага лакальнага раёна. Гэта адбывалася як самастойна, так і пад уплывам культурна-эканамічных сувязяў з суседнім насельніцтвам. Аднак пры ўсім мностве нацыянальных мастацка-дэкаратыўных і тэхналагічных прыкмет беларускае узорнае ткацтва валодае ярка выяўленымі адметнымі рысамі і займае годнае месца ў вобласці сусветнага традыцыйнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У перыяд развіцця вытворчасці ўзорыстых артыфактаў прыкметна пашыраўся спектр беларускіх народных тканін ад самых простых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

штодзённага спажывання да вытанчаных рытуальных тканін, якія ўжываліся ў самыя важныя пераломныя моманты жыццёвага шляху чалавека: нараджэння, вяселля і смерці, дзе кожны элемент дэкору захоўвае ў сабе глыбокае сімвалічнае і магічнае значэнне.

Народныя мастацкія тканіны на ўсёй тэрыторыі Беларусі адрозніваюцца багаццем і разнастайнасцю сваіх відаў і спосабаў ткання, асаблівасцямі арнаментальнага дэкарыравання і кампазіцыйна-колеравага рашэння. На выснове шматвекавога развіцця і паступовага ўскладнення вырабаў народнага ткацтва паўстаў шырокі спектр тканін рознага прызначэння: ручнікі, абрусы (настольнікі, скацеркі), посцілкі (просцілкі, коўдры), дываны (набіванкі, кілімы, суканыя, паласы) дарожкі для падлогі (палавікі, напамоснікі, хадуны, ходнікі), фіранкі на вокны (завескі, фіранкі, афіранкі), прадметы адзёжы (адзенне, адзежа, вопратка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На тэрыторыі ўсіх рэгіёнаў Беларусі пры апрацоўцы гатовых тканых вырабаў, характэрна ўжыванне элементаў вышыўкі і выкарыстанне прошваў карункаў, кутасоў, махроў.

Група дэкаратыўна-утылітарных тканін валодае рознымі функцыямі прымянення і яе можна разглядаць у дзяленні на тры падгрупы: для ўпрыгожвання жылля, для утылітарных патрэбаў і тканыя вырабы змешанага функцыянальнага прызначэння.

Тканыя вырабы **першай** падгрупы чыста дэкаратыўнага характару выкарыстоўваліся для ўпрыгожвання жылля. З гэтай мэтай ткаліся урачыстыя з насычаным дэкорам і разнастайнасцю каляровай гамы, складаныя па тэхніцы выканання ручнікі, абрусы, пакрывалы, дываны, дарожкі на падлогу, фіранкі на вокны. Гатовыя тканіны афармляліся довышыўкай, мярэжкамі, карункамі і інш.

Тканыя вырабы **другой** падгрупы ўжываліся толькі для утылітарных патрэбаў. Для іх ў працэсе вырабу характэрна выкарыстанне часцей за ўсё грубай суровай пражы, а таксама сціплае дэкарыраванне, альбо яго адсутнасць. Чыста функцыянальныя прыкметы неслі ў сабе даматканыя

ільняныя тканіны: бялізны, ручнікі паўсядзённага ўжытку, штодзённыя абрусы, посцілкі і прадметы споднягa адзення. Пазначаныя вырабы па краях падшывалі без дадатковага афармлення.

Да **трэцяй** падгрупы можна аднесці тканіны змешанага функцыянальнага прызначэння. Напрыклад, двайной дэкаратыўна-утылітарнай нагрузкай валодаюць дываны, якія ўпрыгожваюць і ўцяпляюць сцены, а ходнікі ўпрыгожваюць і ўцяпляюць падлогу, акрамя гэтага яны абараняюць палавыя дошкі ад хуткага зносу.

На працягу многіх стагоддзяў адбывалася развіццё спосабаў апрацоўкі сыравіны, ствараліся і развіваліся традыцыйныя тэхнікі ткання, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне.

Спосабаў ткацтва шмат: звычайнае **палатнянае** перапляценне, браная (пераборная) тэхніка, закладная, шматнітовая (шматрамізная).

Самыя складаныя ўзоры сялянкі выконвалі **бранай** тэхнікай. Яна заключаецца ў тым, што за бёрдам адбіраюцца па ліку ў пасму асобныя ніты асновы. Браная пасма чым-небудзь перакладваецца ці перавязваецца ніткай. Ткуць у два ўткі. Націскаючы панажы, атрымліваюць зеў і прапускаюць белы ўток, затым пад «браную» пасму перавязаных нітоў падкладваюць рабром дошчачку — «бральніцу»: «браная» пасма падымаецца, тады прапускаюць другі ўток — чырвоны і прыбіваюць бёрдам. Дошчачку апускаюць, націскаюць другія панажы і прапускаюць белы ўток: дошчачку падкладваюць пад наступную пасму і г. д. У залежнасці ад таго, колькі разоў падкладваецца дошчачка, узор называецца ў 3—5—7—10—20 і г. д. «дошчачак». Выкананыя бранай тэхнікай дываны (посцілкі) двухкаляровыя. Рысунак рэльефны, выпуклы, а на адваротным баку — яго негатыўны адбітак.

Пры **закладной** тзхніцы часцей ткуць шматкаляровыя мастацкія тканіны і дываны. Тут, як і пры бранай, ткуць у два ўткі: адзін уток заўсёды аднаго колеру з асновай, другі ўток шматкаляровы. Пры гэтым спосабе ткацтва каляровы ўток прапускаецца не ўздоўж усяго зева, а толькі праз тую колькасць нітак асновы, якая патрабуецца для ўзору, і вяртаецца назад, таму



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў тканіне ўтвараюцца характэрныя пры закладной тэхніцы невялікія дзіркі. Пры тканні выкарыстоўваюцца два ніты, два панажы, дошчачка, часам «матузы» — ільняныя шнуркі, на якія па аснове набіраецца рысунак тканіны. **Выбарная** тэхніка — адна з разнавіднасцей бранага ткацтва. Узорныя ніткі праходзяць не па ўсёй шырыні тканіны, а ўчасткамі, таксама як у пераборы, паварочваючыся ў пэўных месцах то ў адзін, то ў другі бок. Выбарныя тканіны часцей за ўсё былі шматкаляровымі. У той час як у браным ткацтве рознакаляровыя ўточныя ніткі могуць быць размешчаны толькі гарызантальнымі палосамі, у выбарным ткацтве размяшчэнне колераў можа быць адвольным. Часцей за ўсё выбарная тэхніка спалучалася са звычайнай бранай, выбарны ўзор як бы дапаўняў браны.

Поруч з гэтымі тэхнікамі існуе старажытнае ўзорнае **шматрамізнае**, або **шматнітовае,** ткацтва. Гэта вельмі своеасаблівая традыцыйная тэхніка выкарыстоўваецца для стварэння таго або іншага ўзору з дапамогай большай колькасці нітоў, 4—8—12—16-нітовая аснова перакідваецца ў ніты ў асобным парадку, а панажы падвязваюцца да нітоў у пэўнай сістэме. Пры адной і той жа колькасці нітоў можна выткаць некалькі розных узораў. Напрыклад, на чатырох нітах можна выткаць рознакаляровую посцілку «ў шашкі», сурвэтку з рысункам «у пяць лапак», ручнік «у ёлачку». Розніца ў выкананні таго або іншага рысунка залежыць ад таго, як у ніты перакінута аснова і як ткачыха націскае панажы. Пры выкарыстанні гэтых тэхнік выконваліся розныя ўзоры, як геаметрычныя, так і раслінныя.

У найбольш чыстым выглядзе нацыянальныя адметнасці ткацтва выявіліся ў дэкоры ручнікоў, а таксама адзення. Яно і зразумела: ручнік — не толькі кавалак тканіны, якім выціраюцца. У побыце беларусаў ручнікі здаўна выконвалі таксама разнастайныя абрадавыя функцыі, яны суправаджалі беларуса літаральна ад нараджэння і да смерці. На ручніку прымалі нованароджанага, падносілі хлеб-соль, ім упрыгожвалі покуць з абразамі, на ім апускалі ў магілу труну. Асабліва важную ролю выконвалі ручнікі ў вясельных абрадах. Многія абрадавыя, святочныя функцыі ручнікоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадаўжаюць сваё жыццё і ў наш час. Зразумела, што такая іх важная і разнастайная роля ў народным побыце (і практычная, і дэкаратыўная, і абрадавая) не магла не паўплываць на мастацкі бок гэтых вырабаў.

Пры ўсёй разнастайнасці дэкаратыўных і кампазіцый ных вырашэнняў, якімі вызначаюцца ручнікі з розных куткоў Беларусі, іх аб'ядноўваюць і некаторыя агульныя рысы. Так, напрыклад, вылучаецца вялікая група белых ручнікоў з вышываным ці вытканым геаметрычным узорам традыцыйнага чырвонага колеру (часам з дадаткам чорнага ці жоўтага). Узор звычайна размяшчаецца па канцах ручніка, нібы «сцякае» з яго. Самыя шырокія палосы — каля канцоў, наступныя, бліжэй да сярэдзіны, вузейшыя і размешчаны радзей. На паўночным захадзе Беларусі (Гродзеншчына, поўнач Міншчыны) дэкор можа абмяжоўвацца адной-дзвюма вузкімі безузорнымі палоскамі, у напрамку на паўднёвы ўсход (Магілёўшчына, Гомельшчына) ён гусцее, буйны рамбічны малюнак займае значную плошчу. Найбольш характэрны прыклад — славутыя ручнікі з в. Неглюбка на Гомельшчыне. Насычаны вішнёва-чорны тканы ўзор укрывае амаль усё поле ручнікоў.

Іншы характар маюць вырабы з другога вядомага цэнтра ткацтва — в. Моталь Іванаўскага раёна. Яны прадстаўляюць характэрную для Міншчыны гранічную далікатнасць дэкору. Вузенькія, амаль безузорныя палоскі дэкору рэдка і раўнамерна размяшчаюцца ўздоўж і ўпоперак ручнікоў і абрусаў, утвараючы буйную клетку на срабрыста-шэрым фоне.

Другую значную групу складаюць ручнікі, тканыя ў бела-шэры малюнак па ўсім полі. Узор з адбеленых і суравых нітак мігаціць, пераліваецца, вабіць вока высакароднай срабрыстай каларыстыкай. Матывы звычайна геаметрычныя — квадрацікі, шашачкі, ромбы, васьмівугольныя разеткі і інш.; сустракаюцца і моцна стылізаваныя раслінныя. На Случчыне бытуюць ручнікі, затканыя па ўсім полі сілуэтамі галубкоў, пеўняў, паўлінаў, павернутых дзюбкамі адзін да аднаго. Каларыт можа быць бела-блакітны, бела-зялёны, бела-карычневы.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Надзвычай differences... 

Тыповыя тут і паласатыя посцілкі Вузенькія аднатонныя палоскі падбіраюцца адна да адной,як у вясёлкавым спектры, перабіваючыся фонам цёмнага колеру: чорнага, карычневага, бардовага, зялёнага.

На паўднёвым усходзе Беларусі пераважаюць замкнёныя кампазіцыі з шасці-васьмі буйных фігур па цэнтры, акаймаваныя па краях дробнаўзорыстай паласой. Яркі, насычаны каларыт узору, вытканага звычайна аднабаковым пераборам, эфектна выдзяляецца на чорным фоне.

Паліхромныя дэкаратыўныя кампазіцыі з раслiннымі і зааморфнымі матывамі характэрны для пераборных посцілак і дываноў Цэнтральнай Беларусі, асабліва Случчыны. То матыў «вазоны» па ўсім полі рытмічна размешчаны, то адзіночныя кветкі густа рассыпаны, а то і пчолы між імі..

Вядома, гэтым не вычэрпваецца багацце і разнастайнасць тканых і вышываных вырабаў. Бадай, ніякі іншы від народнага мастацтва не дасць столькі знаходак. Напрыклад, на беларуска-польскім прыграніччы, асабліва ў Гродзенскім раёне, яшчэ жыве старажытнае, унікальнае мастацтва вырабу так званых **падвойных** (двухасноўных) дываноў. Для іх вырабу выкарыстоўваліся дзве асновы, прычым рознаколерныя. Накідалася аснова ў чатыры ніты: першы і трэці аднаго колеру, другі і чацвёрты — іншага. Для стварэння ўзору выкарыстоўвалася браная тэхніка. Прычым пры вырабе такіх дываноў адсутнічаў фонавы ўток (пярэкідзь). Тут ніткі асновы пераплятаюцца не толькі з утком, але і паміж сабой. Дыван атрымліваўся двухбаковым. Напрыклад, з аднаго боку фон зялёны, а ўзор бардовы, а з другога — наадварот.

І ў сельскім, і ў гарадскім інтэр'еры не дзіва ўбачыць стракатую, паласатую, як вясёлка, дарожку-хаднік. Ткуць такія вырабы з розных тэкстыльных абрэзкаў. Колеры і малюнак, вядома, адвольныя, паколькі матэрыял выпадковы, але ў гэтай адвольнасці — як раз уся прывабнасць і непаўторнасць. Круглыя дыванкі вяжуць кручком, узор іх складаецца з кругоў розных колераў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Папулярнымі апошнім часам, асабліва на Гродзеншчыне і захадзе Віцебшчыны, сталі сятчатыя абрусы і накідкі. На раме вяжуць сетку з тоўстых нітак, затым вышываюць па ёй шарсцянымі ніткамі яркі, сакавіты паліхромны ўзор. На белым фоне такі ажурны выраб глядзіцца вельмі эфектна.

Ткацтва як народнае рамяство жыве і развіваецца і ў наш час. Цікавасць да народнага ткацтва (як і да іншых твораў народных майстроўкак) зноў узрос,і на першае месца выйшла дэкаратыўная адметнасць твора. Змяніўся і спажывец: зараз гэта галоўнай выявай гараджанін, які ўжо не саромеецца засцілаць мэблю саматканымі посцілкамі, а крысы - дарожкамі ручной працы. Натуральна, што гэтыя вырабы шырока выкарыстоўваюцца і ў інтэр'еры сельскага жылля.

Такія змяненні ў характары і функцыях народнага ткацтва не маглі не аказаць уплыў на яго дэкаратыўны бок. Творы ткачых узбагачаюцца новымі матывамі, пашыраецца каляровая гама, каларыт становіцца больш сакавітым і насычаным. Збольшага гэта тлумачыцца таксама і тэхнічнымі чыннікамі: ужываннем шоўка, сінтэтычных матэрыялаў, хімічных фарб.

Неабходна адзначыць, што звяртацца к традыцыям варта вельмі асцярожна і ўмела і не кожнаму народнаму майстру гэта пад сілу. Таму ў працы па мадэрнізацыі форм і аздаблення неабходна дапамога кваліфікаванага мастака, які добра ведае традыцыі і тонка адчувае асаблівасці народнага мастацтва.

Дасканалае і мэтанакіраванае вывучэнне айчынных традыцыйных тканін дае магчымасць выявіць іх мастацкія якасці і асаблівасці тэхнікі выканання, вылучыць агульныя рысы і адрозненні з тканымі вырабамі суседніх народаў, а таксама прасачыць распаўсюджванне элементаў народнага ткацтва на тэрыторыі Беларусі і за яе межымі, паказаць даволі пэўную карціну гэтага віда дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, даць яго разгорнутую характарыстыку і вызначыць напрамак творчага выкарыстання набытых ведаў у галіне ўзорыстага ткацтва ў цяперашні і наступны час.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЛІТАРАТУРА

1. Кацар М.С. // Беларускі арнамент. Ткацтва, вышыўка. — Минск . — 1996. — С. 63-64.

2. Курилович А.Н. // Белорусское народное ткачество. – Минск . — 1998. — С. 74-85.

3. Паньшына І.М. Дэкаратыўныя тканіны // Беларускія народныя тканіны ў зборы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР: Каталог. Беларусь. – Минск . — 1979. — С. 212-214.

4. Раманюк М.Ф. Посцілка // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Минск . — 1989. — С. 409.

5. Сахута Я.М. Тканіны утылітарна-дэкаратыўнага прызначэння // Народнае мастацтва Беларусі. – Минск . — 1997. — С. 249, 271.

6. Трызна Д.С. Дыван. // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Минск . — 1989. — С. 43, 66. 96, 141, 151.

Аўтар – дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна –прыкладнога мастацтва Т.І. Васюк

**2.2. Мастацкае рамяство беларускай керамікі**

Каб уявіць месца і значэнне сучаснай мастацкай керамікі, трэба супыніцца на некаторых этапах гістарычнага развіцця рамяства, якое бярэ пачатак у далёкім неаліце. Ужо ў тыя далёкія часы існавала простая падстаўка для лепкі ад рукі тэхнікай налепа ці шнура. У каменным веку чалавек вынайшоў новы штучны матэрыял. абпалены ў вогнішчы чарапок, які набыў каменепадобны стан, які задымліваўся ці гартаваўся і станавіўся воданепраніклівы і прыгодны для захоўвання і прыгатавання ежы. Такім чынам, ва ўсе гістарычныя часы кераміка засталася з чалавекам. Яна з'яўляецца значнай часткай культуры народа, творчаю адоранасць якога мы бачым у экспазіцыях музеяў краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нацыянальны музей гісторыі і культуры, музей старажытнабеларускай культуры НАН РБ, многія абласныя і гарадскія музеі краіны маюць калекцыі археалагічнай керамікі, якая створана па законах хараства. Нашы продкі ў часы палеаліту і неаліту стваралі прадметы высокай мастацкай вартасці. Многія навукоўцы лічаць тыя старажытныя часы нараджэннем мастацтва. З недраў мезаліту і неаліту выйшаў сучасны стыль арнаментацыі, у асноўным гэта геаметрычныя ўзоры. Стыхійныя сілы прыроды нараджалі вобразы разнастайных рэчываў культавага і побытавага прызначэння. Узоры такога далёкага часу былі не схематычныя, а жывыя і пластычныя. Рыскі, ромбы, насечкі, наколы, кропкі, рыскі і шрыхі размяшчаліся на фоне формы рытмічна і пластычна, што вызначае высокую мастацкую вартасць вырабаў.

Пластыка фармованых уручную вырабаў з грубай камяніста-пясчанай гліны з раслінкавымі дамешкамі найлепшым чынам дапоўнена штрыхаваным узорам з геаметрычных элементаў. Вострадонныя і плоскадонныя вырабы гартаваліся на адкрытым агні, устаўленымі ў зямлю вострым ці вузкім дном.

Абпаленая гліна набыла новыя якасці. Чарапок пасля гартавання агнём атрымліваецца воданепранікальным, трывалым і камнепадобным. Так з'явіўся першы штучны матэрыял, якога раней не было ў прыродзе. Да гэтага часу чалавек выкарыстоўваў прыродныя матэрыялы ў якасці асяроддзя пражывання і прадметаў быту і ўпрыгожвання сябе. Па асаблівых прыкметах вырабаў і пластыцы дэкору археолагі падзяляюць кераміку на пэўныя археалагічныя культуры, плямёны якіх пражывалі на тэрыторыі нашай краіны.

Гісторыя развіцця беларускай керамікі адпавядае асноўным этапам развіцця керамічнай вытворчасці іншых краін. У эпоху неаліту з'явіліся разнастайная колькасць сасудаў з арнаментам, умоўна вырашаныя скульптуры людзей і жывёл. У гэты час можна прасачыць развіццё арнаменту, які пачынае развіццё з керамікі. Прасцейшыя ўзоры выдаўліваліся вастрыём у выглядзе штампу, ён адносіцца да ямачна-грабеньчатага стылю. Вырабы мелі разнастайныя камбінацыі пакрыцця паверхні. У значна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазнейшыя часы з’явіўся выразны мастацкі роспіс гліняных вырабаў і рытмічна чаргаваўшыхся кругоў, завіткоў, хвалістых і прамых ліній, сетчатых і шахматных малюнкаў, выкарыстоўвалася каляровае спалучэнне чырвоных, белых і чорных фарбаў.

Адбывалася ўмоўна схематычная перадача з’яў прыроды. Знакі сонца, дажджу, вады мелі магічнае значэнне. Гісторыя керамікі сведчыць аб тым, як трыпольскія майстрыцы маглі “адлучваць” гліну і ад рукі без прыстасаванняў ляпілі гаршкі і скульптуры жанчын, якія хутчэй за ўсё былі багінямі, мацеркамі роду. Такім чынам, ужо ў першабытны перыяд керамічныя вырабы дасягнулі высокай мастацкай выразнасці. Яшчэ хочацца адзначыць, што развіццё арнамента ў сусветным і айчынным мастацтве звязана менавіта з керамікай. Узоры, пакрываўшыя керамічныя вырабы каменнага і жалезнага веку, рытмічна, гарманічна стасуюцца з формай вырабаў. Адсюль узнікла вобласць мастацкай дзейнасці – прыкладное мастацтва.

На Усходнім Палессі жылі плямёны днепра-данецкай археалагічнай культуры, кераміка якой мела грабеньчата-накольчаты характар (V-III ст. да нашай эры). Большая палова помнікаў гэтай культуры знаходзіцца на тэрыторыі нашай краіны, яе паўднёвай частцы. Асноўныя керамічныя формы гэтай культуры – прысадзістыя гаршкі з вострым дном і прамым венчыкам, амаль вертыкальнымі сценкамі, якія плаўна пераходзяць у канічную донную частку вырабу. Вырабы маюць адкрыты шырокі верх. У такіх гаршках земляробчыя плямёны захоўвалі зерне, ягады, рыбу і іншыя набыткі, у іх можна было гатаваць ежу.

Познія формы гаршкоў днепра-данецкай культуры мелі плоскае ці шарападобнае дно. Сярод гаршкоў траплялі кубкі невялікага памеру. Вырабы ляпіліся стужкавым ці шнуравым метадам  налепа з глінянага цеста з дамешкамі пяску, каменьчыкаў і раслінкавымі дабаўленнямі. Звонку выраба паверхня была загладжанай і дэкарыраванай. Арнаментацыя посуду трохпаясная, суцэльная, гарызантальная і на спалучэнні некалькі паясоў з вертыкальнымі і гарызантальнымі рыскамі. У сярэдзіне многіх вырабаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

названай культуры  нанесены грабеньчатыя расчосы. Таўшчыня чарапка ад аднаго да двух сантыметраў. Абпал меў неаднастайны характар з нізкаабпаленымі часткамі чарапрка.

Інстытут этнаграфіі і фальклору НАН РБ у 2004 г. выдаў альбом “Музей старажытнабеларускай культуры”, у якім выдатна адлюстравана навуковая плынь у вывучэнні этнаграфіі і мастацтва. Асабліва цікава ў ім прадстаўлена археалогія, кераміка сярэднявечча і побытавы традыцыйны посуд.

Тэрмін “кераміка” паходзіць ад грэчаскага “керамос”, што азначае “гліна”. Керамічнымі называюць вырабы з гліны, якія абпалены да камнепадобнага стану. У выніку тэрмічнай апрацоўкі мяняе хімічны склад чарапка. Але з даўніх часоў чалавека цікавілі эстэтычныя якасці апрацоўкі гліны, на думку аўтара, у большай ступені, чым фізічныя, функцыянальныя і хімічныя.

Мастацкая кераміка адносіцца да віда дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Як і кожны від мастацтва дэкаратыўна-прыкладное развіваецца па пэўных законах і правілах, яно мае свае прынцыпы пабудовы мастацкага вобраза. Гэтыя прынцыпы выпрацоўваліся тысячагоддзямі, так як дэкаратыўна-прыкладное мастацтва адно з самых старажытных. Яго ўзнікненне адносіцца да часоў верхняга палеаліту.

Перад прыкладным мастацтвам узнікае пытанне стварыць прадметы так, каб імі было зручна карыстацца. Першаму прынцыпу прыкладнога мастацтва адпавядае асноўная частка посуду, які заўсёды ствараўся па законах зручнасці і мэтазгоднасці.

Істотным з’яўляецца вынік стварэння – сам прадмет. Збан павінен быць зручным і прыгожым. Але не кожны створаны чалавекам бытавы прадмет можна аднесці да шэрагу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Часта гэта пытанне выклікае супярэчнасці ў даследчыкаў і навукоўцаў. Крытэрыі ацэнкі мастацкіх якасцяў прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ня так ужо і многа, але імі не заўсёды карыстаюцца бездакорна. Гарманічнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляецца высокім паказчыкам мастацкіх якасцяў. Прыгожы малюнак, часам не адпавядае форме, ці форма патрабуе іншага рашэння.

Неабходна вылучыць і засяродзіць увагу на асноўнай рысе беларускай традыцыйнай керамікі – гэта тое, што форма не дамініруе над дэкорам, а дэкор не забірае на сябе ўвагу. Суладдзе як найвышэйшая форма існавання сусвету. Сапраўдная каштоўнасць і хараство прадмета заключаецца ў сувязі ўсіх яго элементаў.

Напрамак развіцця мастацкай керамікі пачынаецца з гісторыі. У вырабах неалітычнага перыяду знаходзіцца нараджэнне мастацтва ўвогуле.

Керамічная вытворчасць найбольш старажытная на Зямле. Гліна з'яўляецца дасканалым матэрыялам. Вытворчасць мастацкай керамікі налічвае мноства тэхнік, тэхналогій, прыёмаў і матэрыялаў. Невыпадкова мастакі-керамісты заўсёды з павагай адносяцца да гісторыі і тэхналогіі керамікі. Мастаку-керамісту неабходны веды і майстэрства. Невыпадкова ў старажытнай Грэцыі вытворчасць керамічных ваз была вядучым відам мастацтва, не менш значнага, чым архітэктура ці мастацтва. Умелыя майстры чорначырвоных ваз карысталіся вялікай павагай, у іх гонар ставілі помнікі і выбівалі медалі. Гісторыя сусветнай керамікі мае абшырны матэрыял для вывучэння мастацтва гліны.

Традыцыйныя тэхналогіі апрацоўкі керамічных вырабаў:

– ангабіраванне,
– абварная кераміка,
– палівная кераміка,
– гарачае воскаванне,
– халоднае воскаванне,
– глянцаванне,
– дымленне.

Віды традыцыйнай беларускай ганчарнай керамікі

Гаршчок – самым распаўсюджаным відам начынення быў гаршчок. Згодна з "Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы" гэта "круглая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выпуклая гліняная пасудзіна са звужаным дном для гатавання справы". Першыя паліваныя гаршчкі, што мелі петлепадобную ручку, з'яўляюцца ў канцы XV ст., а ў XVI-XVII стст., яны ўваходзяць у шырокі ўжытак. Хаця эвалюцыя формы гэтага начыння на працягу XVI-XIX стст. у цэлым агульныя для ўсёй Беларусі, рэгіянальныя асаблівасці выяўляюцца перш за ўсё ў арнаментацыі і пераваза таго ці іншага тыпу над астатнімі.

Дыяметрны венцаў пераважна ўкладаюцца ў інтэрвал 15-20 см. Начынні XVI-XVIII стст. часта арнаментаваліся па плечаку разнастайнымі відамі геаметрычнага арнаменту з дапамогай калёсіка штампа. Арнамент найчасцей за ўсё ўяўляў сабой сетку з ячэек, ці сетку ромбаў розных памераў са шматраднымі зігзагападобнымі стужкамі, гласкамі ці складанымі геаметрычнымі фігурамі, што адзяляліся адна ад адной вертыкальннымі стужкамі. У сучасных беларускіх ганчароў такі спосаб арнаментацыі начыння называецца карбоўкай.

Паліваныя гаршкі часам мелі ручку-вуха шырынёй 1,5-2 см з раўчукам пасярэдзіне. Яна мацавалася да краю венца пераважна да найбольшага дыяметра тулава. Гаршкі рабіліся з накрыўкай і двумя ручкамі.

Таксама сустракаюцца і таўстасценныя начынні з дамешкай пяску і нават жарствы ў фармовачнай масе, часта з суцэльным рыфленнем па тулаву. Унутраную паверхню гаршчкоў звычайна пакрывалі тоўстым солоем шклопадобнай палівы зялёнага ці карычневага колеру. Гэтыя начынні прыблізна мелі вышыню 25-30 см. Улічваючы параметры і маючы на ўвазе склад фармовачнай масы, можна зрабіць выснову, што яны выконвалі дзве функцыі: выкарыстоўваліся ў якасці тарнага посуду і ў іх маглі час ад часу гатаваць ежу.

Памеры донцаў гаршчкоў звычайна ўкладваюцца ў інтэрвал 8-12 см, сценкі ў прыдоннай частцы раўнамерна пашыраюцца.

Цікавая характэрная рыса, што памеры донца і памер венчыка ніколі не супадалі. Венчык быў у 2-2,5 разы большы за донца. На Палессі гаршчкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зваліся круглякамі.

Збан – самы распаусюджаны від посуду. Збан (збанок, жбан, кукшын, кукшынак) – высокая гліняная пасудзіна, звужаная ўверсе, з вухам і носікам - злівам. Некалькі фрагментаў збаноў, якія кваліфікаваліся як прывазныя, былі знойдзены пад час раскопак у Полацку ў пластах XIII ст. У І.Насовіча і ў Тлумачальным слоўніку беларускай мовы падкрэсліваецца, што збан з вузкім горлам называецца гарлачом. Паліваныя збаны, мяркуючы па археалагічных матэрыялах, мелі дыяметр горла не менш за 11-12 см (каб магла пралезці рука). Часам у ім насілі ваду. Існуе старадаўняя прыказка; “Да пары збан ваду носіць: вушка адарвецца і збан разаб'ецца”. Падчас вывучэння археалагічных раскопак наяўнасць збзнаў вызначаюць па паверхні верхніх частак ці ручак, таму што формай і аздобай ніжняй часткі тулава яны падобныя да гаршкоў.

У здрозненні ад збана гладыш не меў вуха і носіка. Адпаведна слоўнікаў І.Насовіча гэта “обгладившийся, замаслившийся горшок особенно употребляемый для молока”. Дыяметр горла звычайна не перавышаў 11-12 см (каб было зручна браць яго рукой за гладкае горла, якое часцей за усё мела форму раструба). Менавіта па гэтай прычыне гладышы ніколі не паліваліся зверху (звонку), каб не слізгала рука, і яны рабіліся часцей за ўсе не паліваныя, а дымлёныя і глянцаваныя. У XIX-XX стст. гэты від начыння аздабляўся палівай, але толькі знутры. Збаны канца XVI-XVII стст. мелі стужкападобныя ручкі. Яны мацаваліся, як правіла, крыху ніжэй за венца. Самыя раннія збаны пакрываліся зялёнай ці карычневай шкло-падобнай палівай з абедзвюх бакоў. На начыннях XVIII-XIX стст. палива звонку наносілася толькі па горлу.

Збаны найчасцей упрыгожваліся арнаментам не толькі па горлу, але і па плечаку. У асноўным гэта шматраднае рыфленне (наносілася грабеньчыкам), а таксама карбоўка (сеткавы арнамент). Часам збан аздабляўся камбінацыяй гэтых двух відаў арнаментаў, выкананых у розных тэхніках (рыфленне і карбоўка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гляк – гліняная пасудзіна шарападобнай формы з вузенькім горлам і плоскім дном. І.Насовіч лічыць, што сама назва “гляк”, “глёк” паходзіць ад гуку, калі вадкасць выліваецца з гэтай пасудзіны (дыяметр яе гарла не перавышае 4,5-5 см.), ён часта бывае са злівам, як у збана. Аўтар паказвае, што глякі рабіліся “мураўлёнымі”, гэта значыць паліванымі (ў познім сярэднявеччы часцей зялёнай, чым карычневай палівай). Археолагам часцей за ўсё трапляюцца круглыя ці з дзюбкай горлы ад гэтых вырабаў (у першым выпадку начынне можа мець носік-зліў). Падобных знаходак значна менш, чым гладышаў і збаноў.

Цікава дадаць тое, што вучні-чаляднікі здавалі іспыты па тачэнню глякоў, аб гэтым захаваліся легенды Івянецкіх ганчароў. Гляк – найбольш дасканалая форма, якая ўяўляе сабой шар, які нагадвае сонца. Такія цёплыя глякі вырабляе Саўрыцкі, майстар з Лагойска, Пракаповіч з Івянца і іншыя народныя майстры. Глякі рабіліся на беларусі з чатырма ці васьм'ю падвяснымі ручкамі.

Рынка – пасудзіна на трох ножках з ручкай-вухам, альбо ўтулкай для драўлянай ручкі. Ужываліся для смажання розных прадуктаў. На поўначы, паўночным захадзе і ўсходзе і часткова ў цэнтральнай Беларусі. замест рынак сяляне выкарыстоўвалі накрыўкі ад гаршкоў. Рынкі мелі пляскатую паверхню, злёгку адагнутыя сценкі, нагадвалі патэльню і былі зручнымі для смажання прадуктаў у печы.

Найбольшае распаўсюджванне рынкі атрымалі ў XVI-XVII стст. Асноўная частка ўсіх рынак, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі, мае прыблізна ад 3 да 5,5 см. глыбіню пры дыяметры ад 16 да 21 см. Дзяржальныя (полыя - ўтулкі) ў начыннях XVI-XVII стст. маюць на канцы адзін ці два рабрыстыя валікі. Розняцца формы і іх памеры ножак ад 4,5-5 см. Злёгку завостраныя ці гарызантальна зрэзаныя ўнізе, апошнія сустракаюцца значна радзей і не перавышаюць 6,5 см.

Форма тулава піялападобная з патоўшчаным скруглёным венцам. Вельмі рэдка разам з магэрыяламі сярэдзіны XVII ст. першай паловы XVIII ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сустракаюцца глыбокія рынкі да 12 см.., што нагадваюць макотры на ножках. Гэта начынне мае хутчэй за ўсе адну ці дзве ручку-вуха, а таксама прыблізна 10-ці санціментровыя ножкі. Начынне такога кшталту знойдзена ў вялікай колькасці пад час археалагічных раскопак Мірскага замку, Гальшанскага і Мсціслава. Абедзве разнавднасці рынак мелі накрыўкі. Часцей за ўсё яны ахоплівалі начынне зверху. Рынка вельмі трывала стаяла на трох нагах сярод вуголля, калі ў ей гатавалі ежу. Звычайна рынка была пакрыта знутры зялёнай шклопадобнай палівай альбо рудай. Дзякуючы гэтаму посуд добра і чыста мыўся.

У познім сярэднявеччы ў Заходняй Еўропе. А таксама ў Прыбалтыцы і Польшчы побач з рынкамі шырока ўжываліся шматлікія разнавіднасці посуду на трох ножках. Вядомы лінгвіст А.М.Трубачоў прааналізаваў назвы начыння на ножках ў мовах чэхаў, харватаў, славакаў і вызначыў, што ўсе яны з'яўляюхща родаснага паходжання – raindel, vindel - (трохногі гліняны гаршчок ці пыгель), якія ў сваю чаргу паходзяць ад старажытна нямецкага , rain, rainda. Ад асновы rain утварылася польская aynka, runezka, а таксама чэшская, славацкая і іншыя яго прататыпы па меры распаўсюджвання гэтага віду посуду на той або інай тэрыторыі. Зробленыя высновы не супярэчаць археалагічным звесткам.

Найбольш раннія знаходкі посуду на трох ножках зафіксаваны на тэрыторыі Германіі. Там знойдзены непаліваны гаршчок на чатырох ножках, які датуецца XIV ст. Самыя першыя з вядомых рынак на тэрыторыі Беларусі былі таксама непаліваныя. Пра гэта сведчаць знаходкі некалькіх фрагментаў з Лідскага замку, з Мсціслава, датаваныя XV ст. Як і гаршкі гэтага часу, яны зроблены на ручным коле, мелі ляпную ручку амаль цыліндрычнай формы. Крыху пазней увесь посуд выраблялі на нажным коле з аднаго кавалка гліны. Потым, да крыху падвялінага вырабу прыляпляліся ножкі і дзяржак

Арнамент формы і арнаментацыі беларускага посуду паказвае, што мясцовыя ганчары не слепа пераняли форму еўрапейскай рынкі. А ўспрынялі саму ідэю ўжывання посуду на ножках. З пункту гледжання ўтылітарнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прызначэння рынка – гэта ідэальная форма для тагачаснага жыхара ў якасці гатавання ежы. Яна была вельмі ўстойлівая і зручная ва ўжытку і найлепш адпавядала канструкцыі тагачасных печаў.

Беларускія рынкі яшчэ раз упэўніваюць нас у тым, што беларускае ганчарства ўспрыняла еўрапейскую культурную традыцыю. Першыя рынкі, якія зёявіліся на Беларусі з канца XV ст. паступова ўвайшлі ў побыт мясцовых жыхароў. Тутэйшыя майстры ўдасканалілі і надалі ёй традыцыйныя беларускія рысы. У людзей рынка карысталася вялікай папулярнасцю. Аб гэтым сведчыць тое, што на захадзе Беларусі рынкі вырабляліся аж ад пачатку XX ст. У канцы XIX-пачатку XX стст. яны былі ў вытворчасці ў Пружанах і Гародне.

Міска – гэта начынне, якое было не меньш папулярным за талеркі. Меннавіта ежу падавалі ў місках. У слоўніку "Царкоўнаславянскай і рускай мовы" (СЦСРМ) - міскай называюць металічную ці гліняную чашу, у якой падаюць на стол ежу.

Пры археалагічных раскопках вызначыць дзе міска, дзе латушка даволі складана. Каб адрозніць міску ад латкі трэба звяртаць увагу на сляды нагару на вонкавых сценах латушкі. Звычайна ў місках ежу не гатавалі. Таўшчыня сценак і дыяметр венцаў у місках звычайна не перавышае 20 см. У XVI-XVII стст. пераважную большасць місак пакрывалі ўсярэдзіне зялёнай ці карычневай палівай. Разам з міскамі гарызантальна адагнутым нешырокім борцікам сустракаецца начынне з вертыкальным борцікам, які праз прыступку у 1,5-2 см. пераходзіць у донца.

Паліваныя міскі з вертыкальным борцікам ужываліся і ў XIX ст., толькі каленчаты ўступ знікае, і яны маюць ужо цыліндрычна-канічную форму, што добра бачна па шматлікіх знаходках. Міскі акрамя паліў пакрывалі і эмаллю. Сярод місак гэтага тыпу былі вельмі вялікія: з дыяметрам венца ад 40 да 50 см і вышынёй 15-18 см. У якасці сталовага посуду ў гэты час ужываліся міскі з нешырокім, амаль гарызантальна адхіленым венцам з плямамі кантрасных паліў па зялёнаму і найчасцей карычневаму фону.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На тэрыторыі цэнтральнай Беларусі у XVII ст. найбольш распаўсюджанымі былі міскі з гарызантальна адогнутымі нешырокімі борцікамі. Прычым адметнасць гэтых місак у тым, што адогнуты борцік часам таўсцейшы за сцены начыння. Па памерах міскі можна падзяліць на дзве групы: з дыяметрам венца да 25 см і ад 30 да 40 см. Вышыня місак -10-12 см. Міскі з адогнугым борцікам, як правіла, арнаментаваліся па борціку хвалістым арнаментам.

Талерка – найбольш раслаўсюджаным відам начыння з'яўляюцца талеркі. На думку Трубачова, назва "талерка" прыйшла ў беларускую мову з сярэдняверхненямецкай Taljer, куды яна ў сваю чаргу трапіла з італьянскай tagliere (доўка для рэзання мяса).

Талеркі звычайна мелі багатую аздобу: борцік шмат якіх начынняў упрыгожваўся карбоўкай. Як заўсёды, гэта сетка з ромбаў, а таксама бессістэмна нанесеныя калёсікам зігзагападобныя стужкі ці ромбы з іх. Гэта могуць быць слупочкі з адбіткаў квадрацікаў ці промняў, што расходзяцца ад цэнтра, ствараючы ўражанне промняў. Карбоўка часта спалучаецца з рыфленнем (хваля ці адна-дзве паралельныя стужкі).

Борцікі некаторых талерак упрыгожваліся хвалямі, нанесенымі пматграннымі грабенчыкамі. Адзін-два рады хваляў па борціку маюць і некаторыя талеркі з Крэўскага замку. Аднак большасць талерак гэтага тыпу не арнаментавалася. На тэрыторыі Беларусі акрамя паліваных ужываліся дымлёныя, гартаваныя талеркі. Яны мелі звычайна пляскатную форму. Донца ў параўнанні з венчыкам было у 2,5-3 разы меншым. Існавала вялікая колькасць разнастайных талерак, якія і зараз не страцілі сваёй актуальнасці і ўпэўнена ўвайшлі ў попыт чалавека, заняўшы ганаровае месца ў жыцці грамадства.

Талеркі ўвайшлі ў асартымент у XV ст., яны паступова робяцца сапраўднымі творамі мастацтва. Найбольш трапна апісаны формы класічнай талеркі ў слоўніку: “плоская пасудзіна з невялікім паглыбленнем”. Але трэба адзначыць, што суадносіны паміж дыяметрам гэтага паглыблення і шырынёй



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

борціка, а таксама памер паглыбленняі самой талеркі вар'юющца, і часам цяжка дакладна вызначыць, дзе талерка, а дзе паўміск. Талеркі бываюць плыткія і глыбокія. Талерка – гэта посуд, які мае гарызантальна адогнуты борцік шырынёй не менш за 3 см і невялікае паглыбленне.

Макотра – незамянімай у побыце была макотра (макацёр, макот, церніца, церла, церлічка, мяліца, варцяга). Найболып дакладна яе форма вызначана ў "Слоўніку ўкраінскай мовы" Б.Грынчанкі: "гэта род глыбокай глінянай пасудзіны з круглым донцам і значна большым за дно шырокім вусцем." Часцей гэта вялікая доска, якая, напрыклад, у ганчароў з Гародні. магла змясціць ад 2 да 16 кг зерня. Вядомы як непаліваныя, так і паліваныя начынні гэтага віду. Калі першыя прызначаліся для расціраняя маку, яечных жаўткоў, творагу, ільнянога ці канаплянага семя і, асабліва і XVI-XVII стст. рабіліся таўстасценнымі (таўшчыня сценак ад 1 да 1,5 см), то другія, палітыя знутры, найчасцей зялёнай палівай, прызначаліся для разбоўтвання цеста на бліны і прыгатавання салатаў. Вонкавая паверхня часам упрыгожвалася адной-дзвумя рыфлёнымі стужкамі ці хвалямі. Макотры таксама ставіліся ў печ. Няздарма ў слоўніку І.Насовіча згадваецца "повен макацёр заліўкі" і "лапша ў макотры печаная". Каб яе было зручна пераносіць, часам прыраблялі ручку-вуха. Макотра ўжывалася як і сталовы посуд. Менавіта такой разнастайнасцю функцый тлумачыцца розніца ў памерах іі тыпалогіі гэтага віду начыння.

У пластах канца XVI- пачатку XVII стст. адначасова сустракаюцца вялікія "з дыяметрам вусца 25-35 см" непаліваныя макотры з шурпатымі сценкамі і паліванае начыне аналагічных памераў, а таксама і са значна меншым (да 14-15 см) венцам.

Паліваныя макотры канца XVII ст. маюць пераважна ўсечана-канічную форму, а вянец афармляецца ў выглядзе карнізіка, або проста знешнеасіметрычнага патаўшчэння з гарызантальна абрэзаным краем. Яны набліжаюцца да формы адначасных місак, толькі адрозніваюцца больш масіўнымі сценкамі і дыяметрам венца (пераважна 25-30 см). Макотры XVIII-XIX стст. захоўваючы форму тулава папярэдніх, маюць простае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

закругление краю ці венца ў выглядзе вялікападобнага знешнеасіметрычнага патаўшчэння.

Латка (або латушка) – па прапорцыям нагадвалі міскі (дыяметр у 2-2,5 раза перавышалі дыяметр донца и амаль роўны вышыні пасудзіны), а па форме верхняй часцы – гаршок, але з вялікім дыяметрам венца. Гэтую дваістасць формы посуду, які называюць латкай, або латушкай, выдатна засведчаць слоўнікі. Напрыклад, у слоўніку І.Насовіча: “Латка, уменьш. латочка – гліняны посуд, міска з нагнутымі ўнутр краямі”. Пра тое, што латка падобная да міскі можна прачытаць і ў “Смаленскім абласным слоўніку” У.Дабравольскага. Слова “Латка ў значэнні “Патэльня” ўжываецца ў старажытнарусскай, польскай, славенскай і сербскахарвацкай мовай. Латкі сустракаюцца ў пластах XVII-XVIII стст. Вядома, што яны яшчэ бытавалі напачатку XX ст. Як і ўсе віды посуду да XVI ст. і іх адзабляялі традыцыйным для пэўнага рэгіёна арнаметнам. На сценах начыння XVIII ст.ўжо выразна бачныя барозны – сляды пальцаў ганчара. Асабліва папулярнымі былі латкі XVII- XIX стст. ў жыхароў усходняй і паўночнай-ўсходняй Беларусі, што падцвярджаюць і этнаграфічныя дадзеныя. Першыя паліваныя латкі зафіксаваны ў VII ст. Масавы ўжытак іх прыпадае пераважна на XVIII-XIX стст.

Біклагі – выкарыстоўваюцца ў якасці начынняу для транспарціроўкі вадкасці ў XVI - XVII стстс. на Беларусі выкарыстоўваліся біклагі. Сустракаюцца біклагі двух тыпаў: з круглымі і авальнымі тулавамі. Такія біклагі мелі па дзве петлепадобныя папярэчныя ручкі на баках, праз якія нрапускаўся шатузок, што мацаваўся на папрузі. Круглыя біклагі мелі дыяметр прыблізна 14-15 см пры таўшчыні да 7 см. Авальныя біклагі былі крыху большыя (дыяметр 20 см). Яны мелі найчасцей пляскатае донца. Круглыя біклагі маглі мець чатыры маленькія шарападобныя ножкі. Біклагі арнаментаваліся па тулаву некалькімі канцэнтрычнымі кругамі, спіраллю ці хвалістым арнаментам, што ўтвараў круг і нагадваў выяву сонца ці.

Кубак, куфель, кружкі – звычайна пілі з кубачкаў (кубкаў), куфляў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кружак. У аснове апошніх двух ляжыць цыліндр. І.Насовіч, вызначаючы форму куфля (кухля), піша, што гэта “муравлёная гліннаякружка”, тым самым падкрэсліваючы агульнасць іх формы. Іншыя слоўнікі сведчаць, што кружкі і куфлі падобныя да шклянак. Аднак кружка і куфель адрозніваюцца. Першыя па форме больш простыя, крыху вышэйшыя. Куфель звычайна высокі, часам мае не круглае, а прастакутнае вуха, часам два, размешчаныя сіметрычна.

І.Насовіч акрамя тэрміна “куфель” згадвае таксама “кухликъ”, “кухличек – муравленный кувшинчик”. У ТСБМ падкрэслена, што кубак -тэта невялічкая пасудзіна для пітва, звычайна з вухам. На погляд аўтараў, кубкі або кубачкі хутчэй за ўсё нагадваюць па форме невялікія паліваныя або задымленыя гаршчочкі. з ручкай, якія звычайна маюць дыяметр вусця 7-8 см і капіруюць вялікія. Да гэтай высновы вядзе аналіз формы і арнаментыкі звычайных паліваных гаршкоў і кубкаў па матэрыялах керамічных калекцый з кожнага даследаванага горада, замка ці мястэчка. Іх ужывалі як посуд для пітва, падліўкі і падагравання невялікай колькасці ежы (напрыклад, для дзяцей).

Найчасцей сустракаюцца кубачкі з дыяметрам венца ад 7 да 9 см, радзей - 10 см і донцамі ад 4 да 5,5 см. пры вышыні начыння да 10 см. Амаль заўседы плечукі арнаментуюцца або радамі паралельных рыфленых стужак, або карбоўкай, матыў -- сетка ромбаў, квадратаў ці трыкутнікаў. Але ачынні XVIII ст. не арнаментаваліся. Паліва наносілася на ўнутраную паверхню начыння. Звонку кубкі толькі паліваліся да найбольшага дыяметра тулава, хоць у канцы XVI--першай палове XVII стст. сустракаюцца цалкам палітыя кубачкі.

У Цэнтральнай Беларусі ў якасці начынняў для пітва сустракаюцца так званыя бакалы ўсечана канічнай формы. Пераважная большасць іх не паліваная, а дымлёная. Бакал меў рэзкае пашырэнне сценак у верхняй частцы. Паліва на іх звычайна наносілася на ўнутраны бок, а звонкавага боку ішла арнаментацыя. Калі пачалі іх цалкам заліваць палівай, арнаментацыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паступова знікла.

Традыцыя – гэта не застыўшая зтнакультурная з'ява, яна перадаецца з пакалення ў пакаленне, яна квітнее на дрэве рамёстваў і развіваецца сёння. У традыцыйным, народным і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве ў пэўных адносінах існуе цудоўнае і карыснае. Цікава тое, што самая функцыянальная рэч робіцца з пазіцыі прыгажосці і зручнасці. У той жа час чыста дэкаратыўная рэч павінна быць адпаведнай, суразмернай і прыгожай.

Традыцыя ў кераміцы ляжыць у аснове сучаснага развіцця беларускай керамікі. У савецкія часы было амаль знішчана ганчарства як промысел. Але яно захавалася як мастацкае рамяство (В.Лабачэўская). Самабытная характарыстыка тачоных ганчарных вырабаў у значнай ступені аслабла і ў многім страціла характэрныя рысы. У 70-80-ыя гады мінулага веку ў народным мастацтве ўзніклі адораныя носьбіты традыцыйнай культуры. Варта прыгадаць творчасць Такарэўскага з Пружан, Звярко з Івянца, Бычко з Міра, Саўрыцкага з Лагойска ці Прышчэпа з Любаньшчыны. Іх творчасць вызначана высокім прафесіяналізмам у кераміцы.

Але эстэтычная прырода ганчарнага рамяства змянялася пад уплывам названых майстроў. Гаршчкі Такарэўскага ці Саўрыцкага прызначаны ўпрыгожваць чалавечы быт, іх асноўная роля – эстэтычная. Цёмныя задымлёныя і глянцаваныя, яны маюдь вечаровы тонкі, малюнак формы і дэкору ёлачак. Тэракотавы, чырвоны, васкаваны выраб дасканалай формы мае ў сабе “вобраз сонца” (Б.Рыбакоў). Гліна ў такіх вырабах як матэрыял выяўлена максімальна. Ул.Угрыновіч лічыў, што веды рамесніцкіх асноў для сучасных мастакоў-керамістаў павінны быць грунтоўнай асновай. Валоданне тэхнікай, тэхналогіяй і сакрэтамі майстэрства дапамогуць у большай ступені выказаць і асэнсаваць творчую ідэю. Нам неабходна ведаць, што зроблена ў мастацтве папярэдніх часоў.

ЛІТАРАТУРА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Елатомцева, И. М. Художественная керамика советской Белоруссии / И. М. Елатомцева ; ред. М. Я. Гринблат ; Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск : Наука и техника, 1966. – 190 с. : ил.

2. Помнікі этнаграфіі : методыка выяўлення, апісання і збірання / Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Сектар этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР ; пад рэдакцыяй В. К. Бандарчыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 149, [1] с. : іл.

3. Промыслы і рамёствы Беларусі / [В. К. Бандарчык [і інш.] ; рэдкал. : В. К. Бандарчык, В. І. Мялешка, М. Ф. Піліпенка ; Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 190, [2] с. : іл.

**2.2 Відэа- і аудэаматэрыялы**

Медэафонд на электронных носьбітах:

1. А.І. Непачаловіч. “Схемы перапляценняў чатырохнітовых аўтэнтычных тканін Беларусі“.

2. А.І. Непачаловіч. “Фарміраванне творчага патэнцыялу маладых спецыялістаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва“.

3. Г.Ф. Шауро, Т.И. Васюк, А.И. Непочелович. “Структурность, модульность, символичность в традиционном ткачестве Беларуси”.

4. Т.И. Васюк. “Традыцыйныя формы беларускай керамікі і аўтарскія ўзоры на базе народных формаў і тэхналогій.

5. Т.І. Васюк. “Традыцыйныя формы беларускай керамікі”.

6. 5. Т.И. Васюк. “Художественные произведения малой формы”.

7. Л.А. Малахава. «Аплікацыя саломкай”.

8. Л.О Малахова. “Подвесные конструкции “Пауки”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. А.И. Непочелович. “Художественно-стилистические и технологические особенности любанских ручников”.
10. А.И. Непочелович. “Художественно-стилистические и технологические особенности ивенецких постилоки ковров”.
11. Н.П. Бесчаснов. “Художественный язык орнамента”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЕЛ

### 3.1 Практыкум.

**У якасці прыкладу дадаецца занятак на тэму "Мастацка-стылёвыя і тэхналагічныя асаблівасці Івянецкіх посцілак".**

Пачатак засваення законаў стварэння твораў дэкаратыўна-прыкладного мастацва бярэцца з копій лепшых аўтэнтычных вырабаў ткацтва, вышыўкі, керамікі, саломапляцення і інш. Сярод тканых палотнаў Беларусі асобнае месца займаюць выключныя па сваіх мастацкіх якасцях Івянецкія тканыя вырабы. У далёкім мінулым майстрыхі з Івянца і навакольных вёсак у асноўным выраблялі тканіны для адзення і ручнікоў, але ў перыяд канца XIX пачатка XX стагодзяў традыцыйнае ўзорыстае ткацтва гэтага раёна дасягнула найвышэйшага росквіту. У побыце сялян сталі пераважаць дэкаратыўныя тканіны: дываны, посцілкі, абрусы, ручнікі. Знешні выгляд вырабаў заўсёды залежаў ад іх выкарыстання ў якасці прадметаў дэкаратыўна-абрадавага альбо бытавога ўжывання, але найбольш часцей яны выконвалі функцыю ўпрыгожвання хатняга жылля. Тканіны паступова ўзбагачаліся разнастайнасцю кампазіцыйных і каларыстычных вырашэнняў.

Дэкаратыўныя ўзорыстыя дываны і посцілкі атрымалі шырокае распаўсюджванне сярод мясцовых ткачых ў вёсках: Высокая, Еўкавічы, Кульшчыцы, Макасіцы, Сівіца, Слайкаўшчына, Ткачы, Шыкуці і ў мястэчку Івянец. Для посцілак найбольш характэрныя тэхнікі чатырох альбо шасцінітовага двухуточнага ткацтва, даволі часта сустракаюцца і шматнітовыя вырабы, а ў вырабе дываноў пераважае двухбаковы перабор. Непаўторныя ўзоры Івянецкіх посцілак і дываноў прыцягваюць да сябе ўвагу сваёй асаблівасцю ўспрымання свету, незвычайнымі прыёмамі стылізацыі, вытанчанай каларыстычнай гамай і майстэрствам выканання.

Посцілкі выкарыстоўваліся, як у якасці покрываў, так і ў якасці насценных дываноў. У залежнасці ад функцыянальнага прызначэння, будавалася кампазіцыя дэкаратыўных тканін, вызначаўся арнаментальны дэкор і велічыня геаметрычных і раслінных матываў. Цэнтр дываноў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

запаўняўся буйным узорам аздобленым з чатырох бакоў шырокім бардзюрам з больш дробным арнаментам. Посцілкі ўяўлялі сабой мерную тканіну, сшытую з двух палотнаў. Элементы дэкору абавязкова падганяліся адзін да аднаго. Абодва тыпы гэтых дэкаратыўна-утылітарных тканых вырабаў валодаюць багаццем арнаментальных матываў, разнастайнасцю каляровых спалучэнняў і спосабаў выканання.

Выразная кампазіцыйная структура посцілак складаецца з узораў злучаных паміж сабой ромбаў, дзе ў кожным ромбе знаходзіцца яшчэ адзін ромб маленькага памеру, альбо з чаргаваннем квадратаў і прамавугольнікаў, якія ўтвараюць геаметрычныя фігуры ў выглядзе колаў, квадратаў, ромбаў. Нярэдка сустракаюцца ўзоры, якія нагадваюць градацыі рознакаляровых прамавугольнікаў. Асаблівай увагі заслугоўваюць посцілкі “васьмінітовыя дымкі”. Іх узор з геаметрычнымі фігурамі ўяўляе сабой чаргаванне клетак размешчаных у шахматным парадку.

Асаблівую цікавасць выклікаюць прыёмы запаўнення цэнтральнай часткі дываноў буйнымі геаметрычнымі фігурамі ярка выяўленага сімвалічнага характару. Цэнтральнае поле па іх перыметры абавязкова апраўляе шырокая аблямоўка, зубчастая або хвалепадобная, якая напоўнена прамавугольнікамі або ромбамі больш дробных памераў.

Івянецкія посцілкі і дываны з’яўляюцца выразным прыкладам адзінства незвычайнай кампазіцыйнай пабудовы, характэрнага арнаменту і своеасаблівага каларыту. Разнастайнасць дэкаратыўных тканін дасягаецца ўзбуйненнем альбо памяншэннем асобных матываў за кошт розных перапляценняў нітак, што адбываецца пры захаванні адзінага прынцыпа кампазіцыйнага вырашэння. Гэта узнікае у выніку выкарыстання тэхнічных прыёмаў, якія залежаць ад спецыфічнасці запраўкі ткацкіх станкоў.

Разам са своеасаблівымі стылістычнымі прыкметамі, Івянецкія майстрыхі захавалі ў сваіх тканых палотнах традыцыйныя спалучэнні двух колераў, чорнага: з белым, шэрым, чырвоным, малінавым, фіялетавым, жоўтым, аранжавым, зялёным. Дадзеныя каляровыя сумяшчэнні былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадыктаваны тым, што ткачыхі ў якасці асновы звычайна выкарыстоўвалі чорныя ільняныя ніткі хатняга прадзення. Варта адзначыць што падобнымі мастацкімі і тэхналагічнымі якасцямі валодаюць традыцыйныя дываны і посцілкі суседняга Вілейскага раёну, аднак паміж імі існуе і мноства адрозненняў. Суседства Панямоння аказала на іх немалы ўплыў на праяву кантраснасці каляровых  спалучэнняў.

Узорам вышэйшай мастацкай якасці валодаюць непаўторные тканыя шыдэўры Івянецкага музея традыцыйнай культуры. Звяртаюць на сябе ўвагу унікальныя дэкаратыўныя палотны Марыі Іванаўны Дзяніс, сясцёр Станіславы і Яніны Сабалеўскіх з Івянца, патомных ткачых сямейнай дынастыі Сасонак з  вёскі Шыкуці Івянецкага раёну. Прадметы  ткацтва, якія захоўваюцца  ў музейных фондах сведчаць пра тое, што дываны і посцілкі з Івянца і яго наваколля мелі вобразнае рашэннне: ў кветачкі, ў вакенцы і матылі. Таксама ў вырабах увасабляліся складаныя міфалагічныя матывы. Гэта дазваляе казаць аб мясцовай адметнасці івянецкіх ўзорыстых тканін, аб іх самабытнасці і унікальнасці.

Апісанне вышэй названага прыкладу капіравання датычыцца ўсіх сфер дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Методыка выканання задання па стварэнні копій аўтэнтычных прадметаў асноўных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва:

– абмер аб’екта,
– графічны малюнак,
– канструкцыя вырабу,
– тэхналагічная карта,
– увасабленне ў матэрыяле.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 3.2 Апісанне лабараторных заняткаў

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п\п | Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Лабар. заняткі |
| 1. | **Уводзіны.** | **2** | **2** | |
| 2. | **Раздзел 1. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, асаблівасці развіцця ў свеце і на Беларусі.** | | | |
| | Тэма 1. Агляд развіцця ДПМ. Промыслы і рамёствы на Беларусі | **2** | **2** | |
| | Тэма 2. Вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. | **8** | **2** | **6** |
| | Тэма 3. Дэкор і колер у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. | **8** | **2** | **6** |
| **3.** | **Раздзел 2. Тэхналогія дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва** | | | |
| | Тэма 1. Матэрыялы, прылады працы і абсталяванне ў розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва | **8** | **4** | **4** |
| | Тэма 2. Асноўныя прыёмы работы ў розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва | **50** | **4** | **38** |
| **4.** | **Раздзел 3. Сучаснае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Разнастайнасць відаў і сферы выкарыстання** | | | |
| | Тэма 1. Спецыфіка выкарыстання выразных сродкаў у розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва | **16** | **12** | **12** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Тэма 2. Мастацкае праектаванне твора дэкаратыўна-прыкладного мастацтва | **24** | **6** | **18** |
| | Тэма 3. Выкарыстанне прадметаў дэкаратыўна – пракладнога мастацтва ў сучасным інтэр'еры. | **28** | **6** | **22** |
| | | **146** | **40** | **106** |
| | **УСЯГО** | **146** | | |

## РАЗДЗЕЛ УЗОРНАЕ ТКАЦТВА.

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцый | дробнагруп. | сам. раб. |
| **Раздзел I. Развіццё мастацтва ўзорнага ткацтва.** | | | | |
| Тэма 1. Уводзіны: з гісторыі ўзорнага ткацтва. | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 2. Абрадна-рэлігійныя функцыі тканых вырабаў | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 3.Абрадна-святочныя функцыі тканых вырабаў. | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 4. Традыцыйныя утылетарна-ўжытковыя вырабы ўзорнага ткацтва | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма5. Развіццё ўзорнага ткацтва на тэрыторыі Беларусі у XX ст. | 6 | 2 | | 4 |
| **Раздзел II. Тэхнікі і прыёмы ўзорнага ткацтва.** | | | | |
| Тэма 1. Тэхналогія апрацоўкі матэрыялу. | 20 | 2 | 8 | 10 |
| Тэма 2. Характарыстыка пластычных і фізічных якасцяў матэрыяла. Матэрыялы для рэстаўрацыі. | 30 | | 10 | 20 |
| Тэма 3. Асноўныя тэхнікі узорнага ткацтва. Стварэнне бытавых рэчаў і прынцыпы іх рэстаўрацыі. | 40 | | 20 | 20 |
| Тэма.4.Выраб | 12 | | 4 | 8 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| чатырохрамізных тканін. | | | | |
| Тэма 5. Выраб пераборных тканін. Рэканструкцыя як метад. | 30 | | 10 | 20 |
| Тэма 6. Выкарыстанне выбарнай тэхнікі ткацтва. | 50 | | 20 | 30 |
| **Раздзел III. Двухасноўныя, двухслойныя вырабы ткацтва.** | | | | |
| Тэма 1. Падвойнае ткацтва і яго пымяненне. | 14 | | 4 | 10 |
| Тэма 2. Прылады працы і тэхналагічныя асаблівасці падвойнай тэхнікі.. | 16 | | 6 | 10 |
| Тэма 3. Тэхніка і тэхналогія рэстаўрацыі падвойных тканых вырабаў. | 30 | | 10 | 20 |
| Тэма 4. Асноўныя прыёмы вырабу падвойных тканін. | 30 | | 10 | 20 |
| Усяго | 314 | 24 | 102 | 188 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ВМК па дысцыпліне "Дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва" выкарыстоўваюца вучэбна-метадычныя матэрыялы, рэкамендаваныя Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь для выкарыстання ў сферы культуры і адукацыі Беларусі, у тым ліку і для ўкаранення ў адукацыйны працэс БДУКМ. Гэта вучэбна-метадычныя дапаможнікі і рэкамендацыі, якія былі падрыхтаваны ў НТЛ «Традыцыйныя рамёствы беларусаў" і ў выніку выканання навуковага заданні К-16 Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» супрацоўнікамі кафедры доктарам мастацтвазнаўства прафесарам Шауро Г.Ф., дацэнтамі Васюк Т.І., Непачаловіч А.І., Малахавай Л.А..

### Раздзел І. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, асаблівасці развіцця ўсвеце і ў Беларусі

**Тэма 1.** Уводзіны: гістрыя развіцця ўзорнага ткацтва.

Гістарычнае развіццё народнага ткацтва Беларусі і ўплыў старадаўняга ткацтва на сучаснае. Асноўныя тэхнікі.

*Пры выкладанні тэмы 1 рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: “Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе”. Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку “Народны мастацкі тэктыль (ткацтва, вышыўка, пляценне, вязанне) Цэнтральнага рэгіона Беларусі, глава 2.1. Развіццё традыцыйнага народнага ткацтва Беларусі.*

**Тэма 2.** Абрадна-рэлігійныя функцыі ўзорнага ткацтва.

Абрадна-рэлігійная сімволіка дзеяння (рытуала, абрада) і матэрыяла. Падзел тканых вырабаў на бытавыя і культавыя. Прымяненне прадметаў ткацтва на крэсцьбінах, венчанні, адпеванні. Выкарыстанне абраднай тканай атрыбутыкі у рэлігіных святах. Развіццё тэхнік ткацтва з падзелам на бытавыя і абрадавыя.

*Пры выкладанні тэмы 2 рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: “Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе”. Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку “Народны мастацкі тэктыль (ткацтва, вышыўка, пляценне, вязанне)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Цэнтральнага рэгіона Беларусі, глава 2. Развіццё традыцыйнага народнага ткацтва Беларусі 2.2.Традыцыйнае ткацтва і яго разнавіднасці*

**Тэма 3.** Абрадна-святочныя функцыі ўзорнага ткацтва. Культавыя тканыя вырабы і іх выкарыстанне у беларускіх абрадах календарных святаў.

*Пры выкладанні тэмы 2. рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: "Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе". Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку "Народны мастацкі тэктыль (ткацтва, вышыўка, пляценне, вязанне) Цэнтральнага рэгіона Беларусі, глава 2. Развіццё традыцыйнага народнага ткацтва Беларусі.*

*2.2.Традыцыйнае ткацтва і яго разнавіднасці.*

**Тэма 4.** Традыцыйныя утылетарна-ўжытковыя вырабы ўзорнага ткацтва.

Асартыментны рад утылетарна-ўжытковых вырабаў ўзорнага ткацтва. Утылетарнае прымяненне тканых вырабай у дамашей гаспадарцы.

*Пры выкладанні тэмы 4 рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: "Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе". Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку "Народны мастацкі тэктыль (ткацтва, вышыўка, пляценне, вязанне) Цэнтральнага рэгіона Беларусі, глава 2. Развіццё традыцыйнага народнага ткацтва Беларусі.2.2.Традыцыйнае ткацтва і яго разнавіднасці*

**Тэма 5.** Развіццё ўзорнага ткацтва на тэрыторыі Беларусі у ХХ ст. ХХ стагоддзя.

Узнаўленне і развіццё традыцыйнага ткацтва Беларусі у сярэдзіне ХХ века. Асаблівасці развіцця сучаснага беларускага ткацтва. Творчасць народных майстров ўзорнага ткацтва канца ХХ-пачатка ХХІ в.в.. Дзейнасць НДМЛ "Скарбніца" і Барысаўскага камбіната прыкладнога мастацтва імя А.М. Кішчанка. Аб'ёмна-пpасторавыя тканыя кампазіцыі. Манументальны тэкстыль Беларусі.

*Пры выкладанні тэмы 5 . рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: "Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе". Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку "Народны мастацкі тэктыль (ткацтва, вышыўка, пляценне, вязанне) Цэнтральнага рэгіона Беларусі, глава 4.1 Мастакі, творцы-ствральнікі выбітных твораў у тэхніцы ткацтва Барысаўскага камбіната дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Тэхнікі і прыёмы ўзорнага ткацтва.

**Тэма 1.** Тэхналогія апрацоўкі матэрыялу.

Пдрыхтоўка абсталявання, прылад працы і матэрыялаў да вырабу вучэбных работ, у тым ліку: сноўка асновы, навіўка асновы, запраўка ткацкага стана. Асаблівасці работы на ткацкім абсталяванні.

Дапаможныя матэрыялы і прылады працы.

**Тэма 2.** Характарыстыка пластычных і фізічных якасцяў матэрыяла.

Пластычныя якасці баваўнянай, ільняной, шэрсцянай (і інш.) сыравіны.

**Тэма 3.** Асноўныя тэхнікі узорнага ткацтва. Стварэнне бытавых рэчаў і прынцыпы іх рэстаўрацыі.

Асноўныя тэхнікі і прыёмы беларускага народнага ткацтва: палатняная, закладная, браная, рамізная, пераборная, выбарная, ажурная, падвойная двухасноўная. Выраб тканін рознага прызначэння.

*Пры выкладанні тэмы 3 . рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: “Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе”. Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку “Асноўныя тэхнікі традыцыйнага ткацтва Беларусі і схемы перапляценняў чатырохнітовых аўтэнтычных тканін”, глава 1.1. “Асноўныя тэхнікі беларускага народнага ткацтва*”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 4.** Выраб чатырохрамізных тканін.

Разнастайнасць магчымацей чатырохрамізнай тэхнікі і яе рэгіянальныя асаблівасці. Прыёмы стварэння ўзора у гэтай тэхніцы на ткацкім абсталяванні.

**Тэма 5.** Выраб пераборных тканін. Рэканструкцыя як метад.

Традыцыі пераборнага ткацтва і рэгіянальныя асаблівасці тэхнікі. Прыёмы стварэння ўзора у пераборнай тэхніцы на ткацкім абсталяванні. Прынцыпы рэстаўрацыі. Рэканструкцыя.

**Тэма 6.** Выкарыстанне выбарнай тэхнікі ткацтва.

Традыцыі выбарнага ткацтва і яго рэгіянальныя асаблівасці. Прыёмы стварэння ўзора у выбарнай тэхніцы на ткацкім абсталяванні.

Распрацоўка эскіза і выкананне твора на аснове традыцыйных і новых тэхналогій.

**Раздзел III. Двухасноўныя, двухслойныя вырабы ткацтва.**

**Тэма 1.** Падвойнае ткацтва і яго прымяненне.

Традыцыйныя гродзенскія падвойныя дываны. Прыёмы стварэння ўзора у падвойнай тэхніцы на ткацкім абсталяванні.

Распрацоўка эскіза і выкананне твора на аснове традыцыйных асаблівсцей двухасноўнай тэхнікі.

**Тэма 2.** Прылады працы і тэхналагічныя асаблівасці падвойнай тэхнікі.

Пдрыхтоўка абсталявання і матэрыялаў да вырабу вучэбных работ. Асаблівасці работы на ткацкім абсталяванні пры выкананні двухасноўных тканін.

**Тэма 3.** Тэхніка і тэхналогія рэстаўрацыі падвойных тканых вырабаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Старажытныя спосабы вырабу двухлойных ўзорных тканін. Характэрныя асаблівасці выканання падвойных тканін і іх выкарыстанне ў рэстаўрацыі.

*Пры выкладанні тэмы 3 рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: "Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе". Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку "Асноўныя тэхнікі традыцыйнага ткацтва Беларусі і схемы перапляценняў чатырохнітовых аўтэнтычных тканін", глава 2.1. "Складаныя тэхнікі традыцыйнага ткацтва*".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 4.** Асноўныя прыёмы вырабу падвойных тканін.

Засваенне працы на ткацкім абсталяванні у падвойнай тэхніцы. Асноўныя прыёмы падвойнага ткацтва.

*Пры выкладанні тэмы 4 рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: "Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе". Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку "Асноўныя тэхнікі традыцыйнага ткацтва Беларусі і схемы перапляценняў*

*чатырохнітовых аўтэнтычных тканін", глава 3.2. "Схемы перапляценняў чатырохнітовых аўтэнтычных тканін Беларусі".*

Вобразнае вырашэнне твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Заданне 1.

Праца над эскізам твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва пад агульнай тэмай "Мастацкае ўвасабленне традыцый"

Заданне 2.

Выкананне ў матэрыяле у абранай студэнтам тэхнікі ткацтва па ўласным эскізе твора па тэме "Мастацкае ўвасабленне традыцый".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэматыка і метадычныя указанні да лабараторных занятках па дысцыплінах ДПМ (ганчарства і кераміка)

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п\п | Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыі | Лабар. заняткі |
| 1. | **Уводзіны.** | **2** | **2** | |
| 2. | **Раздзел 1. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, асаблівасці развіцця ў свеце і на Беларусі.** | | | |
| | Тэма 1. Агляд развіцця ДПМ. Промыслы і рамёствы на Беларусі | **2** | **2** | |
| | Тэма 2. Вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. | **8** | **2** | **6** |
| | Тэма 3. Дэкор і колер у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. | **8** | **2** | **6** |
| **3.** | **Раздзел 2. Тэхналогія дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва** | | | |
| | Тэма 1. Матэрыялы, прылады працы і абсталяванне ў розных відах | **8** | **4** | **4** |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва | | | |
| | Тэма 2. Асноўныя прыёмы работы ў розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва | **50** | **4** | **38** |
| **4.** | **Раздзел 3. Сучаснае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Разнастайнасць відаў і сферы выкарыстання** | | | |
| | Тэма 1. Спецыфіка выкарыстання выразных сродкаў у розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва | **16** | **12** | **12** |
| | Тэма 2. Мастацкае праектаванне твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва | **24** | **6** | **18** |
| | Тэма 3. Выкарыстанне прадметаў дэкаратыўна – пракладнога мастацтва ў сучасным інтэр'еры. | **28** | **6** | **22** |
| | | **146** | **40** | **106** |
| | **УСЯГО** | **146** | | |

**Тэма 1. Ганчарства Беларусі як значная частка матэрыяльнай культуры краіны**

Дадзеная тэма разглядае праблему захавання беларускай унікальнай традыцыі ў ганчарнай вытворчасці. У наш час ганчарнае рамяство адрадзілася ў новай якасці. Гэта ручная мастацкая вытворчасць гліняных вырабаў. Ёй займаецца значная частка народных майстроў і мастакоў-керамістаў. Вопыт, які набыты на працягу тысячагоддзяў, значна ўзбагачае творчасць сёняшніх майстроў. Народныя майстры пад кіраўніцтвам прафесара Я.М.Сахуты, вырабляюць традыцыйны беларускі сувенір у тэхніцы глянцавання, задымлення, абвары і ангобнага роспісу. Мастакі-керамісты пад кіраўніцтвам вядомага мастака В.А.Калтыгіна аднаўляюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старажытныя тэхналогіі абпалу керамікі ў горне па прыкладу японскіх майстроў раку, але выкарыстоўваючы айчынныя традыцыі.

У беларускім ганчарстве ёсць свае рэцэпты і сакрэты адмучвання і нарыхтоўкі гліны, якой паўсюдна багата наша краіна. Залежы пластычнай беламалочнай гліны ў Пінскім раёне Брэсцкай вобл. каля в.Гароднай і ў яе ваколіцах вызначылі высокамастацкую вытворчасць глінянага посуду. Вельмі добрымі якасцямі вылучаецца гліна ў Івянцы недалёка ад Налібоцкай пушчы. Каля Рэчыцы ў Гомельскай вобласці дабывалася яркая чырвона-тэракотавая гліна са значным утрыманнем жалеза. Зараз недалёка ад Радашковіч здабываецца пластычная кар'ерная гліна, якая добра выкарыстоўваецца для ганчарнай вытворчасці.

*Пры выкладанні тэмы 1 рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: "Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе". Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку "Народная мастацкая кераміка Цэнтралнага рэгіёна", глава2. "Ганчарнае мастацтва на тэрыторыі Беларусі XIX – XX стст.*

**Тэма 2. Пластычныя якасці гліны і этапы прыгатавання керамічнага цеста.**

Гісторыя прыгатавання гліны "дзедаўскім " метадам і сакрэты яе "адмучвання" вельмі цікавыя. Яна фарміруе адносіны да гліны, як дакаштоўнага матэрыялу. Павага да гістарычнага рацэсу нарыхтоўкі сыравіны вядзецца разам з сучасным тэхналагічным абсталяваннем. Выкарыстанне ручных прыёмаў працы дае магчымасць адчуць пластычнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гліны, як асноўную яе характарыстыку. Выраб пробнікаў надае студэнтам неабходныя практычныя навыкі. Правільна прыгатаванае керамічнае цеста ёсць аснова поспеху пры фармоўцы вырабу. Са студэнтамі праводзіцца інструктаж па тэхніцы бяспекі і санітарных нормах працы.

**Тэма 3. Метады, прыёмы і спосабы тачэння на ганчарным коле**

Засваенне выпрацаваных метадаў фармоўкі вырабаў на ганчарным коле застаюцца амаль нязменнымі на працягу вякоў, але працэс не адбываецца адначасова. Ён пачынаецца з размінкі нарыхтаванай гліны, якая змешваецца з вадой да пластычнага стану. Мацаванне камяка гліны па цэнтры ганчарнага кола.Пачатак цэнтраімклівага руху рабочага дыска. Цэнтроўка. Пракол камяка з пэўным прыёмам рук. фармоўка донца, сценак цыліндрычнай асновы вырабу, пры дапамозе выцягвання цыліндра. Прафілізацыя вырабу па тулаву і венчыку адбываецца на заключным этапе. Працэс фармоўкі прадугледжвае выкарыстанне прылад працы: стэкаў, дроціка, паралона. Перад пачаткам заняткаў адбываецца інструктаж па тэхніцы бяспекі і санітарных нормах працы.

**Тэма 4. Асноўныя віды ганчарнага посуду, яго асартыментныя групы, функцыянальнае прызначэнне.**

Эвалюцыя формаў ганчарнага посуду адбывалася на працягу тысячагоддзяў. Асноўныя віды ганчарнага посуду былі сфарміраваны ў сярэднявеччы. Да нашага часу захавалася разнастайнасць форм гаршкоў, збаноў, глякаў, гладышоў, місак, рынак, кубкаў, талерак, рукашыяў, пражнікаў, макотраў, авзонаў. гарбатнікаў, падсвечнікаў, слояў, бутляў, адстойнікаў, маслабоек, латачак. Кожны з названых відаў мае сваю канструктыўную і мастацкую характарыстыку і адпавядае пэўнаму функцыянальнаму прызначэнню. Гліняныя пасудзіны маюць тулава, шыйку, венчык, плечукі, донца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гаршкі дзеляцца на пячныя і палявыя. Пячныя гаршкі выраблялiся з накрыўкамі, вухам-ручкай. Палявыя абвязваліся ручніком ці мелі ручку. Гэта спарышы ці трайнікі.

Збаны – пасудзіны функцыянальнага прызначэння для захоўвання малака ці вяршкоў, мёду. Маюць тулава. шыйку, венчык. носік. ручку і донца.

Глякі адносяцца да тарнага посуду, у якім захоўваецца алей, пітво. напоі. Вырабляецца з ручкай або некалькімі для функцыі.

Гладышы мелі шырокае распаўсюджванне на тэрыторыі краіны. Форма т сілуэт іх мае пластычныя радыюсныя спалучэнні. У гладышах захоўвалі малако. Адбываецца падзяленне посуду па асартыментных групах, функцыянальным прызначэнні. Кухонны, пячны, аптэчны, гігіенічны, сталовы посуд.

*Пры выкладанні тэмы 4. рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: "Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе". Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку "Народная мастацкая кераміка Цэнтралнага рэгіёна", глава 3.2. "Віды традыцыйнай беларускай керамікі"*

**Тэма 5. Віды дэкору ганчарнага посуду.**

Вялікая ўвага ў Беларусі надаецца дэкору керамікі ў сырым стане з мэтай эканомі другога і трэцяга абпалу. З неаліту вядома багацце наколаў, насечак, рысак, штрыхоў, налепаў, дэкору пальчыкамі рук, адбіткаў травы, фактур, тэкстур чарапка. У вучэбным працэсе ставіцца задача на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстанне гістарычнага вопыту. Заданне па гравіроўцы паверхні вырабаў у воскападобным сырым стане. Выкананне пробных прац па копіі гравіровак і аўтарскае вырашэнне тэмы. Глянцаванне адносіцца да архаічных тэхнік дэкору, які мае значэнне пры наданні чарапку больш трывалага стану. Для беларускай керамікі характэрнымі з’яўляюцца ўзоры дэкору ў “елачкі”, ромбы, сеткі, паясы, якія размешчаны на форме вырабаў. Выконваецца шэраг пробных вырабаў з глянцаваннем у воскападобным сырымм стане. Роспіс і пакрыццё паверхні ганчарных вырабаў ангобамі, каляровымі глінамі таксама выконваецца па сырому чарапку. Найбольш яскравым прыкладам распісной ангабіраванай керамікі з’яўляюцца вырабы з в.Гароднай, што на Брэстчыне. Нахіленыя паяскі з мазкоў чырвонай глінай па беламалочным фоне маюць адметнасць мастацкую і тэхналагічную. Выконваюцца копіі і аўтарскія роспісы ангобамі. Для івянецкай керамікі дваццатага стагоддзя характэрна фляндроўка з расчэсаных каляровых паяскоў белага і зялёнага колеру на чырвоным тэракотавым фоне.  Выконваюцца заданні па відах роспісу ангобамі па сырому чарапку на адзінкавых формах, наборах і камплектах ганчарных вырабаў і ручной ляпной пластыкі.

Значная частка керамікі 19-20 стагоддзя дэкарыравалася з дапамогай палівы, якая наносілася на гліняныя вырабы цалкам ці часткова.Палівы выкарыстоўваліся ў асноўным празрыстыя і толькі зрэдку, у кафлярстве, глухія. Палітра паліваў паліхромная, але суладная ў спалучэнні з тэракотавым фонам гаршка. Неабходна выканаць заданні на тачэнне ганчарных вырабаў з нанясеннем палівы па “дзедаўскім” і сучасным метадзе у выглядзе набораў, камплектаў і адзінкавых эксперыментальных аўтарскіх вырабаў.

*Пры выкладанні тэмы 5 рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: “Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе". Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку "Традыцыйныя формы беларускай керамікі і аўтарскія ўзоры на базе народных формаў і тэхналогій" ", глава 1 "Віды беларускай традыцыйнай керамікі"*

**Тэма 6. Сушка і абпал керамікі**

Тэхналогія апрацоўкі керамічных вырабаў з'яўляецца яе сутнасцю. Пакуль выраб не загартаваны, ён не існуе як самастойная форма, таму што мае зваротны ход зноў пераўтварыцца ў гліну пры дапамозе вады. Гарт ці абпал керамікі адбываецца пасля сушкі вырабаў, калі з іх паверхні выдаляецца вільгаць. Хімічныя працэсы па вылучэнні вады адбываюца пры тэмпературы да 480°. У вучэбным працэсе разам з лабарантам і выкладчыкам студэнты назіраюць працэс сушкі і ўсадкі вырабаў, затым працэс абпалу на практыкаваннях з ангобамі, палівамі, флюсамі. Засвойваюць віды абпалаў: акісляльны, аднаўленчы, перапынены гарт, да якога адносіцца абвара і раку. Выконваюцца заданні па распрацоўцы аўтарскіх форм і копій традыцыйнай керамікі.

*Пры выкладанні тэмы 6 рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: "Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе". Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*“Народная мастацкая кераміка Цэнтралнага рэгіёна”, глава 7.“Тэхналагічныя асаблівасці апрацоўкі традыцыйнай керамікі”*

**Тэма 7. Выраб пластыкі і свісцёлак з выкарыстаннем стылёвых асаблівасцяў ганчарных цэнтраў Беларусі**

Выраб пластыкі адбываецца па 2 асноўных метадах: лепка на ганчарнай аснове і лепка з пласта. Трэці метад спалучае тэхніку лепкі з пласта і і ганчарную аснову з дадатковымі элементамі. Тэма задаецца выкладчыкам. Эскізы выконваюцца напачатку на ўзорах з рэгіянальнымі асаблівасцямі. Напрыклад, майстар Звярко з Івянца амаль заўсёды выконваў пластыку на ганчарнай аснове з выакрыстанем лепкі, фактур, размалёўкі ангобамі. Выконваецца пластыка па ажыццяўленні ідэі ў мастацкім вобразным рашэнні.

Класічны варыянт івянецкай свісцёлкі часам падаецца сухім, але гэта проста адметнасць мясцовая, дзе выпрацаваны пэўныя тэхналогііў лепцы вобразаў птушак, бараноў, конікаў. Студэнты выконваюць копіі і аўтарскія ўзоры на зададзеную тэму.

*Пры выкладанні тэмы 6 рэкамендавана выкарыстоўваць вынікі задання: “Распрацаваць комплекс методык даследавання народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як неад'емнага кампанента нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі. Распрацаваць гістарычна абгрунтаваную тыпалогію і выявіць мастацка-вобразныя асаблівасці развіцця народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на сучасным этапе. Стварыць базу дадзеных "Аднаўленне, засваенне, захаванне і рэпрэзентацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў адукацыйным працэсе”. Матэрыялы адлюстраваны ў дапаможніку “Народная мастацкая кераміка Цэнтралнага рэгіёна”, глава 3.3.“Мелкая пластыка майстроў Цэнтральнага рэгіёна Беларусі”*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 8. Асновы кафлярства на Беларусі.**

Асабліва цікавая тэма па кафлярстве патрабуе засваення шэрагу тэхналагічных прыёмаў пры фармоўцы кафлі. Напачатку кафля была гаршковай, затым значна пазней з'явілася новая канструкцыя кафлі з румпом. Для вывучэння трэба засвоіць стылі, у якіх выраблялася кафля, і тэхналогію фармоўкі і дэкарыравання яе палівамі. Выконваецца копія дывановай і партрэтнай кафлі. Распрацоўваецца аўтарскі варыянт кафлі.

**Тэма 9. Ручная лепка з грубых і тонкіх матэрыялаў.**

Заданне па тэме ручной лепкі мае мэту авалодання прыёмамі фармоўкі з шамоту сучасных дэкаратыўных кампазіцый. Для леппкі з шамоту выкарыстоўваюцца некалькі прыёмаў: налепам, шнурам, пластом, фармоўкай у гіпсавай загатоўцы. Кожны метад разглядаецца як самастойна, так і ў спалучэнні. Заданні выконваюцца на тэму міфалогіі, анімалістыкі, на формаўтварэнне з выкарыстаннем авангардных і традыцыйных накірункаў.

**Тэма 10. Стварэнне прасторавых кампазіцый у ляпной, ганчарнай і змешанай тэхніцы для інтэр'ера**

Заданне прадугледжвае значную эскізную і макетную распрацоўку. Ансамблі керамічных форм распрацоўваюцца канструктыўна. Вывучаюцца плоскасныя віды кампазіцый, выкананыя ў матэрыяле ў спалучэнні з аб'ёмнымі формамі. Задаецца характар інтэр'ера: грамадскі, загарадны, камунальны, жылы, маладзёжны, офісны і інш. Набываюцца навыкі макетавання і працы ў маштабе. Высокім балам ацэньваецца прафесійная распрацоўка асяроддзя, якое арганічна і маштабна спалучаецца з кампазіцыйнымі працамі, выкананымі ў матэрыяле, у якіх выкарыстаны традыцыйныя тэхналогіі апрацоўкі гліны і сучаснае формаўтварэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ВМК

## 4.1. Заданні для кантралюемай самастойнай работы і графік яе кантролю

Для кожнага студэнта факультэта ТБКіСМ выкананне самастойнай работы. Кантралюемая самастойная работа выконваецца па напрамках і відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яна павінна адпавядаць патрабаванням выкладчыка, мець паслядоўную форму выканання і спіс даследчых мастацкіх крыніц. Пры стварэнні студэнт мае права на аўтарскі разгляд абранай тэмы.

**Формы выканання самастойнай работы:**

- Распрацоўка візуальнага графічнага эскіза
- Абгрунтаванне мастацкага вобраза
- Абгрунтаванне кампазіцыўнага і каляровага рашэння
- Выкананне ў матэрыяле

**Прыкладныя тэмы для самастойнай работы:**

1. Гістарычная тэматыка.
2. Школы і стылі адлюстраваныя ў гістарычных перыядах сусветнага і беларускага мастацтва.
3. Арнаментальныя кампазіцыйныя вырашэнні вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
4. Анімалістычная і антрапаморфная пластыка ў вырабах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
5. Знакава-геральдычная сімволіка ў вырабах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
6. Сюжэтна-тэматычныя кампазіцыі для інтэр’ерна-присторавых рашэнняў.
7. Спецыфіка канструктыўна-пластычнага праектавання твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 Тэматыка курсавых і дыпломных работ студэнтаў.

Тэмамі курсавых і дыпломных работ з'яўляецца зварот да вытокаў спадчыны нацыянальнай беларускай культуры і агульна-сусветнымі набыткаў.

Разнастайныя тэмы і сюжэты творчых прац студэнтам неабходна чэрпаць у беларускім фальклёры, этнаграфіі, міфалогіі, а таксама у мастацкай творчаці народных і прафісіных майстроў, кранаюцца тэмы сучаснага мастацтва.

**Спіс прыкладных тэм курсавых і дыпломных работ студэнтаў.**

| **Курсавыя работы** | **Дыпломныя работы** |
|---|---|
| 1.”Архітэктурны помнік” | 1.”У промнях сонца” |
| 2.”Горад Мінск” | 2.”Зорка надзеі” |
| 3.”Зімні пезаж” | 3.”Ціхае паляванне” |
| 4.”Стары сад” | 4.”Дарога да храма” |
| 5”Сутонне” | 5.”Мірскі замак” |
| 6.”Стажары” | 6.”Забытыя гулні” |
| 7.”Красавік” | 7.”Чароўны човень” |
| 8.”Вялікдзень” | 8.”Развітанне з летам” |
| 9.”Вясновыя птушкі” | 9.”Сонечная птаха” |
| 10.”Зімовы вечар” | 10.”Восеньскія радужкі” |
| 11.”Летні пейзаж” | 11.”Святочны настрой” |
| 12.”Натхненне” | 12.”Ціхі вечар” |
| 13.”Восеньскі шлях” | 13.”Пад небам блакітным” |
| 14.”Цудоўны сон” | 14.”Успаміны” |
| 15”Кветачкі” | 15.”Начны горад” |
| 16”Ціхае надвор’е” | 16.”Прадрэва” |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.3 Пералік пытанняў к заліку ці экзамену

1. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, асаблівасці развіцця ў свеце і на Беларусі,
2. Асаблівасці развіцця мастацтва беларускага ўзорнага ткацтва,
3. Асаблівасці развіцця мастацтва вышыўкі на тэрыторыі Беларусі,
4. Асаблівасці развіцця мастацтва беларускага ганчарства і керамікі,
5. Асаблівасці развіцця саломаппляцення на Беларусі,
6. Асаблівасці развіцця мастацкай апрацоўкі дрэва, металу і шкла на Беларусі,
7. Асаблівасці развіцця беларускага роспісу па тканіне і набойкі,
8. Ачагі буйных промыслаў і рамёствыаў на тэрыторыі Беларусі,
9. Вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў галіне беларускага ўзорнага ткацтва і вышыўкі,
10. Вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў галіне беларускага ганчарства і керамікі,
11. Вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў галіне апрацоўкі дрэва, металу і шкла,
12. Вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў галіне саломапляцення,
13. Вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў галіне маляванкі і набойкі,
14. Мастацка-стылёвыя асаблівасці аутэнтычных прадметаў беларускага узорнага ткацтва і вышыўкі,
15. Мастацка-стылёвыя асаблівасці аутэнтычных прадметаў беларускага ганчарства і керамікі,
16. Мастацка-стылёвыя асаблівасці аутэнтычных прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі ў галіне апрацоўкі дрэва, металу, і шкла,
17. Рэгіянальныя мастацка-стылёвыя асаблівасці аутэнтычных прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі ў галіне саломапляцення,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

18. Рэгіянальныя  мастацка-стылёвыя асаблівасці аутэнтычных прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі ў галіне роспісу па тканіне і набойкі,

19.  Кампазіцыйны строй, дэкор і колер у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі, падабенства і адрозненні па відах.

20. Тэхналогія вырабу прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі ў розых відах і напрамках,

21.  Матэрыялы, прылады працы і абсталяванне ў розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва,

22. Асноўныя прыёмы работы ў розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва**,**

23. Сучаснае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, разнастайнасць відаў і сферы выкарыстання,

24. Спецыфіка выкарыстання выразных сродкаў у розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва,

25. Спецыфіка выкарыстання выразных сродкаў у стварэнні вырабаў беларускага узорнага ткацтва і вышыўкі,

26. Спецыфіка выкарыстання выразных сродкаў у стварэнні вырабаў беларускага ганчарства і керамікі,

27. Спецыфіка выкарыстання выразных сродкаў у стварэнні вырабаў у галіне апрацоўкі дрэва, металуі шкла на Беларусі,

28. Спецыфіка выкарыстання выразных сродкаў у стварэнні вырабаў у галіне саломапляцення,

29. Спецыфіка выкарыстання выразных сродкаў у стварэнні вырабаў у галіне роспісу па тканіне і набойкі на Беларусі,

30.  Асноўныя законы мастацкага праектавання твора  дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва,

31.  Стварэнне мастацкага вобразу прадметаў дэкаратыўна-пракладнога мастацтва для сучаснага інтэр’ера, іх выкарыстанне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

32. Мастацкае праектаванне прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва для сучаснага інтэр’еру.

33. Сродкі стварэння ў матэрыяле прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прызначаных для сучаснага інтэр’еру.

**Патрабаванні да праглядаў (бягучых, заліковых, экзаменацыйных)**

Формай кантролю праходжання студэнтамі спецыяльнай дысцыпліны з’яўляецца прагляд. Прагляды падзяляюцца на бягучыя, заліковыя, экзаменацыйныя.

Бягучыя прагляды праводзяцца на працягу вучэбнага семестра для завяршэння этапу працы над вучэбным заданнем (праз 1 – 1,5 месяца).

На заліковы ці экзаменацыйны прагляд студэнты прадстаўляюць цалкам завершаныя графічныя праекты (на планшэтах ці замоўленых фарматах), вырабы ў матэрыяле і іншыя заданні. Кожнае заданне павінна адпавядаць зададзенай тэме, адказваць асноўным патрабаванням графічнай падачы і выкананню ў матэрыяле, мець канчатковае мастацкае афармленне і несці неабходную паясняльную інфармацыю.

На заліковы і экзаменацыйны прагляд студэнты павінны прадставіць заданні, якія прапрацоўваліся на працягу семестра. Частковае выкананне тэм, або незавершанае экспанаванне праекта уплывае на канчатковую адзнаку навучэнца.

Для атрымання заліку або здачы экзамену па дысцыпліне “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” студэнты прадстаўляюць на кафедральны прагляд работы, выкананыя на працягу семестра ў поўным аб’ёме. На іспытах вуснае апытанне спалучаецца з праглядам работ кожнага студэнта. Квіткі для экзаменаў складаюцца зацвярджаюцца кафедрай. Прагляд практычных работ праводзіцца ўсім калектывам кафедры ў залікова-экзаменацыйны перыяд.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.4 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэтаў

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах, законах. |
| 4 (чатыры) | Недастатткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца ВНУ ў дзейнасці сучасных устаноў сацыякультурнай сферы, шляхоў і сродкаў засваення тэмы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва). Веданне даследчай і навукова-метадычнай літаратуры. |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу, веданне структуры аналізу навучання. Наяўнасць неістотных памылак. |
| 6 (шесць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўных навукова-метадычных матэрыялаў і метадычнага фонду па дысцыпліне. Наяўнасць неістотных памылак. |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя знанні і уменні. Разгорнутая фармуліроўка вывадаў. Уменне аналізаваць вучэбны працэс. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, знанні і уменні. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных і практычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 9 (дзевяць) | Усведамленне студэнтам працэсаў карыснага выкарыстання адукацыі і веданне інавацыйных шляхоў і сродкаў яе ўдасканалення, асэнсаванне досведу па эстэтычнаму аздабленню навучання. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных і практычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць структуру вучэбнага працэсу, карыстацца навукова-метадычнай літаратурай, законамі практычнага характару з аўтарскім падыходам па акрэсленых пытаннях абранай тэмы. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне праблем арганізацыі вучэбнага працэсу ў ВНУ як навуковай галіны. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных і практычных пытанняў адукацыі ў ВНУ на сучасным этапе. Уменне з творчым падыходам прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з'явы традыцыйнай мастацкай культуры і мастацтва з улікам набытых ведаў у галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, карыстацца навуковай літаратурай па сусветнай і нацыянальнай культуры і мастацтву Беларусі. Пры стварэнні практычных распрацовак аўтарскае прымяненне інавацыйных метадаў па рэканстукцыі, развіццю і рэтрансляцыі мастацка-стылёвых і тэхналагічных традыцый айчыннага дэкаратыўна-прыкладнга мастацтва ў сучасных мастацкіх творах. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЕЦЕНЗИЯ**
на учебно-методический комплекс по дисциплине
«Декоративно-прикладное искусство»
доцентов кафедры народного декоративно-прикладного искусства
Белорусского государственного университета культуры и искусств
Непочелович Аллы Ивановны, Васюк Тамары Ивановны

Представленный на рецензию учебно-методический комплекс по дисциплине «Декоративно-прикладное искусство» имеет четкую структуру и состоит из четырёх разделов.

В содержании пояснительной записки УМК отражены цели и задачи учебного издания по представленной тематике. В теоретический раздел входит комплекс лекций с кратким изложением разделов и тем учебной программы, а также материалы, помогающие студентам в изучении дисциплины. В структуре УМК доступно отражены особенности учебного материала, рекомендации по организации работы с УМК. Использование данных материалов способствует укреплению и расширению знаний и умений студентов.

Характерной чертой учебно-методического комплекса по дисциплине «Декоративно-прикладное искусство» является наличие приложений, в которых содержится примерная тематика учебных, курсовых и дипломных работ, а также рекомендации по их выполнению. Предлагаемая направленность лабораторных занятий даёт студентам возможность закрепить и реализовать в материале знания, полученные на лекционных занятиях. Данная методика способствует освоению научных методов обучения и развитию эффективности творческого процесса.

Представленный на рецензию учебно-методический комплекс по дисциплине «Декоративно-прикладное искусство» выполнен на высоком научно-методическом уровне в соответствии с требованиями Государственного образовательного стандарта высшего профессионального образования Республики Беларусь и может быть рекомендован к внедрению в учебный процесс вуза.

Рецензент:
директор филиала «Институт искусствоведения,
этнографии и фольклора ГНУ «Центр исследований
Белорусской культуры, языка и литературы
Национальной академии наук Беларуси»,
заведующий отделом изобразительного
и декоративно-прикладного искусства,
доктор искусствоведения, профессор В. И. Жук

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЕЦЕНЗИЯ**

на учебно-методический комплекс по дисциплине
«Декоративно-прикладное искусство»
доцентов кафедры народного декоративно-прикладного искусства
Белорусского государственного университета культуры и искусств
Непочелович Аллы Ивановны, Васюк Тамары Ивановны

Учебно-методический комплекс по дисциплине «Декоративно-прикладное искусство» имеет четкую структуру и состоит из четырёх разделов, каждый из которых отражает цели и задачи учебного издания.

В теоретическую часть учебно-методического комплекса входит пояснительная записка с рекомендациями по организации работы с УМК, раздел с конспектами лекций, а также учебно-методические материалы, использование которых может оказать существенную помощь студентам в изучении дисциплины «Декоративно-прикладное искусство».

Практический раздел УМК содержит тематику лабораторных занятий, порядка их проведения и реализации исполнения работы в материале. В разделе рекомендуется комплексная методика по реставрации, реконструкции и ретрансляции художественных и технологических традиций белорусского декоративно-прикладного искусства.

В структуру УМК входит раздел контроля самостоятельной работы, в котором содержится тематика учебных, курсовых и дипломных работ, а также рекомендации по их выполнению. Данная методика способствует результативному освоению научных методов обучения будущих специалистов художественного профиля в области декоративно-прикладного искусства.

Представленный на рецензию учебно-методический комплекс по дисциплине «Декоративно-прикладное искусство», выполнен на высоком научно-методическом уровне, полностью соответствует всем требованиям Государственного образовательного стандарта высшего профессионального образования и может быть рекомендован к внедрению в учебный процесс вуза.

Заведующая кафедрой
мировой и отечественной культуры
Белорусского государственного
университета культуры и искусств,
доктор искусствоведения, профессор В. П. Прокопцова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЕЛ

### 5.1 Вучэбная праграма

**Установа адукацыі**
**“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

______________ Ю.П. Бондар
"_____"_____________2012 г.
Рэгістрацыйны нумар ВД ____

**ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА**
***Вучэбная праграма***

***па спецыяльнасці 1-15 02 01 “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва” па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-15 02 01-07 ”Дэкаратыўна –прыкладное мастацтва” (рэстаўрацыя вырабаў)***

Мінск 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

Л.У. Дамнянкова, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук;

Т.І. Васюк, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

Л.А. Малахава, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

А.І. Непачаловіч, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

Н.А. Аждер, выкладчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

А.В. Шаціло, выкладчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Жук В.І., доктар мастацтвазнаўства, намеснік дырэктара Інстытута Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь;

Пракапцова В.П., загадчык кафедры беларускай сусветнай мастацкай культуры установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", доктар мастацтвазнаўства, прафесар.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ У ЯКАСЦІ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ** : кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол №10ад 28.08.2012 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 1 ад 24. 09. 2012 г.

Адказны за рэдакцыю

Адказны за выпуск Дамнянкова Л.У.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных
устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі
ў галіне культуры і мастацтваў

# ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

***Тыпавая вучэбная праграма***
***для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці***
***1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),***
***напрамак спецыяльнасці 1-18 01 01-04 Народная творчасць***
***(народныя рамёствы)***

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______________ А.І.Жук
"14" ___05___ 2010 г.
Рэгістрацыйны № ТД-___/тып.
№ ТД-С.034/тып.

**ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА**

***Тыпавая вучэбная праграма***
***для вышэйшых навучальных устаноў***
***па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),***
***(напрамак спецыяльнасці 1-18 01 01-04 Народная творчасць***
***(народныя рамёствы)***

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік аддзела навучальных
устаноў і работы з творчай моладдзю
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
______________ Н.Ю. Шмакава
"__" ___красавіка___ 2010 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення вышэйшай
і сярэдняй спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______________ Ю.І. Міксюк
"14" ___05___ 2010 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб'яднання вышэйшых
навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь
па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
______________ Б.У. Святлоў
"2" ___красавіка___ 2010 г.

Рэктар дзяржаўнай установы адукацыі
"Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы"
______________ М.І. Дзямчук
"03" ___05___ 2010 г.

Эксперт-нормакантралёр
______________ Р.М. Казуцэвіч
"03" ___05___ 2010 г.

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнікі:**

*Л.У.Дамнянкова,* дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат гістарычных навук;

*Т.І.Васюк,* дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”;

*Л.А.Малахава,* дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”;

*С.В.Матвейчык,* выкладчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*аддзел* выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Інстытута мастацтвазнаўства, этнагарафіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

*Я.Ф. Шунэйка,* дацэнт кафедры гісторыі і тэорыі мастацтва ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 10 ад 28.05.2008 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 3 ад 25.11.2008 г.);

навукова-метадычным саветам па народнай творчасці (па напрамках) Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 3 ад 13.04.2009 г.)

Адказны за рэдакцыю В.М.Сакалова
Адказны за выпуск Л.У.Дамнянкова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА**

***Тыпавая вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), напрамак спецыяльнасці 1-18 01 01-04 Народная творчасць (народныя рамёствы)***

Рэдактар В.М.Сакалова
Камп'ютэрная вёрстка А.У.Гіцкая

Падпісана ў друк 02.06. 2010 г. Фармат 60x84 1/16.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,80. Ул.-выд. арк. 0,49.
Тыраж 50 экз. Заказ 139.

УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў".
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 2.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў".
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі універсітэт культуры

# УЗОРНАЕ ТКАЦТВА

Вучэбная праграма па спецыялізацыі
«народныя рамёствы»

Мінск 2000

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграму распрацавала выкладчык А.І. Непачаловіч

Рэцэнзент: сябра Саюза мастакоў Беларусі, намеснік дырэктара Мінскага гарадскога вучэбна- прафесійнага цэнтра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Г.М. Сіверцава

Рэкамендавана да друку на пасяджэнні прэзідыума вучэбна-метадычнай рады Беларускага універсітэта культуры 24 чэрвеня 1999г.(пратакол N 10)

© Беларускі універсітэт культуры, 2000г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі універсітэт культуры

# ГАНЧАРСТВА І КЕРАМІКА

Вучэбная праграма
па спецыялізацыі "народныя рамёствы"

Мінск 1999

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 738 (073)
Г 195
ББК 85.125.1

Праграму распрацавала ст.выкладчык Васюк Т.І.
Рэцэнзент: сябра Саюза мастакоў Беларусі Марачкін А.А.
Рэкамендавана да друку на пасяджэнні прэзідыума вучэбна-метадычнай рады Беларускага універсітэта культуры 24 чэрвеня 1998 г. (пратакол №10)

Г 195 **Ганчарства і кераміка**: Вучэбная праграма па спецыялізацыі "народныя рамёствы". — Мн.: Бел. ун-т культуры, 1999. — 12с.

У вучэбнай праграме прапануюцца прыёмы і навыкі авалодвання ганчарным промыслам. Прыводзяцца звесткі па гісторыі развіцця беларускай керамікі.

Праграма прызначана студэнтам, аспірантам і выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтва.

©Беларускі універсітэт культуры, 1999

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5.2 Асноўная літаратура**

1. Говор, В. Художественные ремёсла и промыслы Белоруссии / В. Говор, Е. Сахута. – Мн.: Навука і тэхніка, 1988.− 270 с.
2. Кацер, М. С. Народно-прикладное искусство Белоруссии / М. С. Кацер – Мн.: Вышэйшая школа, 1972.− 176 с.
3. Моран, А. История декоративно-прикладного искусства: от древних времён до наших дней / А. Моран – М.: Искусство, 1982.− 577 с.
4. Основы художественного ремесла /Вышивка. Кружево. Художественное ткачество. Ручное ковроделие. Художественная роспись тканей: практ. пособие для руководителей школьных кружков // ред. В.А. Барадулина, О.В. Танкус. – М.: Просвещение, 1978.− 255 с.
5. Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя / пад рэд.: І.П.Шамякіна [і інш.].– Мн.: БелСЭ, 1989.− 575 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5.3 Дадатковая літаратура**


1. Дамнянкова, Л.У. Мастацкі роспіс тканін: дапам. для студэнтаў мастацка-графічнага факультэта / Л.У. Дамнянкова. – Віцебск, 1994.– 29 с.
2. Курилович, А.Н. Белорусское народное ткачество / А.Н. Курилович. – Мн.: Наука и техника, 1981.– 119 с.
3. Лобачевская, О.А. Возьми простую соломку / О.А. Лобачевская, Н.М. Кузнецова – Мн.: Полымя, 1988. – 142 с.
4. Милюченков, С. А. Белорусское народное гончарство / С. А. Милюченков. - Мн.: Наука и техника, 1984. – 160 с.
5. Селивончик, В. И. Возрождение ремесла: практическое пособие по ручному узорному ткачеству / В. И. Селивончик, М. Н. Винникова. – Мн.: Полымя, 1993. – 144 с.
6. Фадзеева, В. Я. Беларуская народная вышыўка / В. Я. Фадзеева. – Мн.: Навука и техника, 1991. – 199 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ